Нашы ў Пунску ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Памяці Анатоля Сыса ☞ 9-10

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2793) Год LIV | Беласток, 22 лістапада 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Юбілей „Васілёчкаў”

„Васілёчкі” выступілі ў суправаджэнні гродзенскага аркестра „Ліра” пад кіраўніцтвам Міколы Фадзіна (справа)

Юбілей 45-годдзя дзейнасці Хор песні і танца „Васілёчкі” адсвяткаваў 14 лістапада ў вялікай кампаніі ў Бельскім доме культуры. На святкаванне былі запрошаны аркестр „Ліра” з Гродна, калектыў „Арляне”, былыя дырыжоры хору і шмат іншых знатных гасцей. На ўрачыстым мерапрыемстве з'явілася многа публікі з Бельска і навакольля, якая прыйшла паслухаць беларускіх песень у выкананні „Васілёчкаў” у суправаджэнні гродзенскага аркестра.

Частку песень склалі творы, да якіх музыку напісаў вядомы гродзенскі кампазітар Яўген Петрашэвіч. Спецыяльна пад святочную вечарыну склаў ён словы і музыку песні „Запрашаем сябры, калі ласка”. Гэты твор упершыню прагучаў са сцэны ў час юбілею і вельмі спадабаўся публіцы, аб чым красамоўна пасведчылі бурныя і працяглыя апладысменты.

— Вашы песні пачуццёва-кранальныя. Вы вярнулі мяне ў маладосць. Спяваеце творы, якія я чуў у дзяцінстве, — усхвалявана заявіў, прослязіўшыся, кампазітар Яўген Петрашэвіч, які горача павіншаваў „Васілёчкі”. — Добра, што выконваеце таксама мае песні. Гэта дар ад сэрца да сэрца.

У час мерапрыемства кветкі і словы падзякі ад харыстаў атрымалі былыя дырыжоры „Васілёчкаў”. Успаміналі яны сваю працу з калектывам, падкрэслівалі вялікую заангажаванасць харыстаў у дзейнасць для супольнай справы. У час святкавання ўспамінам не было канца, бо і было аб чым паўспамінаць. 45 гадоў — перыяд, несумненна, багаты на падзеі. „Васілёчкі” праспявалі за гэты час вельмі многа песень, далі шмат канцэртаў і наведалі розныя цікавыя мясцовасці. Выступалі таксама і за межамі нашай краіны, перад усім у Беларусі. Вядучыя мерапрыемства асаблівую ўвагу звярнулі на Уладзіміра Весялоўскага, які выступае ў хоры ад самага пачатку па сённяшні дзень (праўда, з 8-гадовым перапынкам) ды зачыталі фрагмент яго артыкула ў „Ніве” (быў ён нашым карэспандэнтам) на тэму хору.

На канцэрце ранейшыя песні ў выкананні „Васілёчкаў” перапляталіся з сучасным рэпертуарам. Кіраўнік хору Ніна Бялецкая паінфармавала, што з неапрацаванымі фальклорнымі песнямі „Васілёчкі” выступаюць у час абрадных аглядаў і фэстаў. Перад юбілейнай вечарынай харысты многа рэпеціраваліся, каб дастойна запрэзентавацца перад публікай. Думаю, што гэта спевакам з Бельска ўдалося. Асабліва займальна выступілі яны пад акампанемент аркестра „Ліра” з Гродна, якім дырыжыраваў і заадно іграў на акардэоне Мікола Фадзін. Публіка горача апладзіравала юбілярам, а на тварах сабраных было відаць усмешкі. Радасна праводзілі час не толькі людзі старэйшага ўзросту, але і малодшая публіка.

Юбілейная ўрачыстасць была добрай нагодай, каб зацікавіць спяванем у хоры малодшых асоб.

— У нашым доме многа спявалі і рабілі гэта з любоўю. Мой быцька Уладзімір Талвінскі належаў да „Васілёчкаў” амаль ад самага пачатку і ў сямідзесятых гадах пераканаў мяне запісацца ў хор. Бацька ўцягнуў у хор таксама маіх сясцёр Крысціну і Вяславу, а я пасля — мужа. Калі я запісвалася ў хор, у мяне было малое дзіця, але гэта не перашкодзіла ў спеве, — сказала Галена Саковіч, якая ў хоры спявае больш за трыццаць гадоў, а цяпер выступае разам з мужам Славамірам (з яе сям'і ў хоры займалася 8 асоб). — Зараз я ўгаварваю сына, каб запісаўся да „Васілёчкаў” і ён нават мае ахвоту, але няёмка яму, што толькі ён адзін малады будзе. Я гавару, што нехта мусіць быць першым, а пасля можа і іншыя малодшыя запішуцца, бо патрэбная нам падмена.

У час урачыстасці „Васілёчкі” былі ўзнагароджаны дыпломам Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны. Кіраўнік хору Ніна Бялецкая атрымала спецыяльную ўзнагароду, а харыст Мікола Іванчук — ганаровую адзнаку Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны „Заслужаны для польскай культуры”. Харыстаў віншавалі шматлікія госці і людзі з публікі.

— Я ўжо 20 гадоў займаюся з арлянскім калектывам і за гэты час назіраў за „Васілёчкамі”. Гэта быў адзін з лепшых хароў Беласточчыны, а цяпер і мне прыйшлося быць яго дырыжорам, — заявіў Мікола Фадзін, які штодзень разам з жонкай Людмілай, якая займаецца харэаграфіяй бельскага калектыву, працуюць у Коледжы мастацтваў у Гродне. На юбілейны канцэрт дырыжор Фадзін прывёз з Гродна аркестр „Ліра”, якім сам кіруе, чым выклікаў вялікае зацікаўленне ў публікі. З прыгожымі беларускімі песнямі выступілі таксама „Арляне”. У час, калі юбіляры пераапраналіся ў новыя касцюмы, выступіў таксама гурт „Лайланд”. Аднак найбольшае зацікаўленне выклікалі выступленні „Васілёчкаў”. Трэба верыць, што прыйдзе падмена старэйшым харыстам, калі не ў выглядзе маладых спевакоў, то людзей сярэдняга ўзросту. А цяперашнія харысты хай яшчэ доўга выступаюць нам на сцэне, расслаўляючы родную песню.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гальшаны • Высокае • Масты • Беласток • Бельск-Падляшскі • Сямятычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Беларускі Берлінскі мур ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Не, не і не... Берлінскі мур яшчэ не рухнуў. Яшчэ рана святкаваць яго падзенне. Ён ёсць. Мур як стаяў, так і стаіць. Толькі не на тым месцы, дзе раней. Яго перасунулі да беларускай мяжы...

Была княгіня Ануся ☞ 3

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Алег Жугжда ў БЛТ ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мастацкае слова... ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

Беларускі Берлінскі мур

Свет святкуе дваццацігоддзе падзення Берлінскага муру. І хай сабе гэтай гістарычнай даце радуецца не ўвесь свет, веліч падзеі ад гэтага не змяншаецца. Факт застаецца фактам: 9 лістапада 1989 года, прастаяўшы 28 гадоў, Берлінскі мур рухнуў, пахаваўшы пад сабой жорсткае супрацьстаянне халоднай вайны, якое ледзь не перарасло ў самае гарачае супрацьстаянне з ядзерным падагрэвам.

Мур рухнуў не сам па сабе, і нават не па старасці, і не з-за кволасці будаўнічых матэрыялаў. Зроблены ён быў нават не на стагоддзі, а на вякі вечныя (так меркавалі тыя, хто яго будаваў). Мур знішчылі людзі. Тыя людзі, якія заўсёды лічылі, што ён непатрэбны, і ўвесь час змагаліся за тое, каб ён не псаваў аблічча планеты і не раздзяляў людскіх лёсаў.

А ён раздзяляў. Раздзяляў не толькі Берлін. Ён раздзяляў нямецкую нацыю, Еўропу, цэлы свет, вольнасць і няволю, свабоду і прыгон, чалавека і чалавека... Па абодва бакі таго раздзяляючага муру жылі людзі. Працавалі, кахалі, стваралі сем'і, нараджалі дзяцей, рабілі кар'еру. Толькі заходнікі ніколі не імкнуліся трапіць ва ўсходнюю частку. А вось мноства людзей з усходняй часткі муру стараліся пералезці праз яго і трапіць у заходнюю цывілізацыю. Некаторым смельчакам гэта ўдавалася. А многія загінулі, так і не рэалізаваўшы сваёй мары папасці ў Вольны свет.

Пасля падзення ненавіснай свабоднаму чалавецтву сцяны, свет змяніўся цалкам. Пайшлі незваротныя працэсы разбурэння Савецкай Імперыі. Многія народы зноў аднавілі сваю незалежнасць, пачалі будаваць уласную дзяржаўнасць. Абудзіліся памкненні агульнаеўрапейскай інтэграцыі. Межы знікалі, як здані на раніцы. Прыкладам, каб трапіць з Беларусі ў Польшчу, у якую зусім нядаўна дабрацца было амаль немажліва, цяпер трэба было ўсяго толькі набыць так званы ваўчар, які каштаваў менш долара. Каму ад гэтага было кепска?

Здавалася, што ніхто больш не будзе перашкаджаць гэтым працэсам, бо ім перашкаджаць не толькі не было патрэбна, але і неразумна. Толькі дэбіл мог не заўважыць, што гэта ўсходнія немцы кінуліся на захад, а не наадварот. Гэта Усходняя Германія стала скарыстоўваць здабыткі заходняй палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сістэмы, а не заходнія немцы палезлі ў прапагандаваны бальшавікамі „камуністычны рай". Доказы таго, што жыць простаму і не простаму чалавеку атрымліваецца лепш, багацей, вальней і чалавечней па заходняй мадэлі, больш не патрабаваліся. Гэта было відавочна, як і тое, што заходні свет гатовы быў спрыяць працэсам дэмакратызацыі і перабудовы эканомікі далёка на ўсход. Ажно да Японскага мора.

Але... Знайшліся і такія людзі, якім перспектыва ўсеагульнага дабрабыту і вольнасці ды свабоды для ўсіх народаў і грамадзян не спадабалася. Хіба таму, што гэта для ўсіх, а не толькі для „абраных". І ў хуткім часе пачуліся галасы пра тое, што заходняя цывілізацыя не для нас, славян. Напачатку гэтыя галасы загучалі ў Расіі, на Крамлі. Там яны ўсё мацнелі, злелі, вар'яцелі, і неўзабаве, як рэха, сталі чутны і ў Беларусі.

Час нібыта павярнуў назад... Зноў ваенныя вучэнні ля заходняй мяжы... Рускія і беларускія вайскоўцы адпрацоўваюць сумесныя дзеянні на выпадак вайны з заходнім ворагам... Будуецца новая сумесная расійска-беларуская сістэма супрацьпаветранай абароны для аховы неба міфічнай дзяржавы з аналагічнай назвай... Антызаходняя прапаганда гучыць з экранаў тэлевізараў і старонак дзяржаўнай прэсы ў лепшым стылі горшых савецкіх часоў...

Не, не і не... Берлінскі мур яшчэ не рухнуў. Яшчэ рана святкаваць яго падзенне. Ён ёсць. Мур як стаяў, так і стаіць. Толькі не на тым месцы, дзе раней. Яго перасунулі да беларускай мяжы. Але ад гэтага ён не змяніўся, і функцыі выконвае тыя самыя: раздзяляе Еўропу, цэлы свет, вольнасць і няволю, свабоду і прыгон, чалавека і чалавека... Яго рамантуюць, аднаўляюць, робяць больш трывалым. Але ён рухне, як і тады, дваццаць год таму. Пры ўмове, канешне, што як і тады, знойдуцца людзі па абодва яго бакі, якія будуць змагацца за тое, каб гэты Беларускі Берлінскі мур не псаваў больш аблічча планеты...

Віктар САЗОНАЎ

Ціхі патрыярх

15 лістапада адышоў у вечнасць на 96-м годзе жыцця сербскі патрыярх Паўле, у міры Гойка Стойчавіч. Нарадзіўся ён 11 верасня 1914 года ў вёсцы Кучанцы, што на ўсходзе сённяшняй Харватыі, у даліне Дравы, побач венгерскай мяжы. У той час, калі толькі што ўспыхнула Першая сусветная вайна, ягоная родная вёска знаходзілася на тэрыторыі Аўстра-Венгрыі. Сям'я будучага патрыярха жыла з земляробства, але за хлебам ягоны бацька на той час выехаў у Амерыку, дзе захварэў туберкулёзам, вярнуўся на радзіму і тут жа памёр, калі малому Гойку было тры гады; неўзабаве памерла і ягоная маці. Сіратою заапекавалася цётка, якая вырашыла паслаць асірацелага і слабавітага хлапчука ў школы, бо і ён сам праяўляў ахвоту да навукі. У 1925-29 гадах вучыўся ён у гімназіі ў Тузлі, а пазней, у 1930-36 гадах у багаслоўскай семінарыі ў Сараеве (абодва вялікія гарады ў сённяшняй Босніі і Герцагавіне). Далей будучы патрыярх паступае ў Бялград на багаслоўскі факультэт, які завяршыў сама перад выбухам Другой сусветнай вайны; да таго часу ўспеў ён прайсці і другі курс медыцынскага факультэта; рыхтаваўся ён быць не толькі лекарам чалавечай душы, але і цела. У пачатку вайны працаваў на будовах, аднак з-за слабога здароўя падаўся ў Аўчарскі манастыр (каля Чачака на захадзе Сербіі), дзе ў 1946 годзе прыняў манаскую паслугу. Ратаваўшы дзяцей з рэчкі Дрын, ён у 1944 годзе моцна прастудзіўся і лекары не лічылі магчымым яго аздараўленне, аднак ён акрыяў, хаця два гады не адпускала яго гарачка. Служыў у розных сербскіх манастырах, у 1955-57 гг. штудзіраваў багаслоўе ў Афінах і ў 1957 годзе быў назначаны Рашка-Прызранскім епіскапам (у цяперашнім Косаве). У 1990 годзе стаў сербскім патрыярхам.

Доўгае жыццё патрыярха Паўла выпала на складаны час, на час абедзвюх сусветных войнаў. Праўда, яму пашчасціла быць па-за эпіцэнтрам сербскіх бедстваў: у Першую сусветную вайну — зімовага бежанства сербскага насельніцтва ў Албанію, у другую — усташаўскага тэрору, ад якога загінуў ягоны брат. Але войны 1990-х гадоў закранулі і яго: найперш, 20 снежня 1991 года была разбурана царква ў яго родных Кучанцах, а пазней многія сербы вымушаны былі пакінуць ягоную Косаўскую епархію. Насуперак усталяванай ва ўсходнім хрысціянстве традыцыі, першастаяцель сербскай Царквы асудзіў палітыку тадышняга сербскага лідара Слабодана Мілошавіча. Патрыярх гаварыў: „Гэтыя падзеі прадвяшчаюць найгоршае, таму не спыняемся па-бацькоўску напамінаць расхваляваны народ, маладых і старых, каб трымаліся здалёк ад усялякіх беспарадкаў, каб сілавікі стаялі на стражы парадку і міру, а не ўлады, якая трагічна для нас усё глыбей патанае ў несвядомасці сваіх учынкаў". Прыведзеныя словы можна было б паўтарыць і ў адрас найрупліўшых вонкавых памагатых сербскага дыктатара. „Спадзяюся, што Бог раскрые вочы гэтай уладзе, каб перастала сеяць зло ў гэтым намучаным народзе", — гаварыў у 1997 годзе. Хацелася б дадаць, што не толькі той уладзе...

Не толькі да ўладароў звяртаўся спачылы патрыярх. „Нават у найгоршых абставінах трэба аставацца чалавекам, і няма такой мэты, ні нацыянальнай, ні індывідуальнай, якая б магла быць апраўданнем бесчалавечнасці". „Няволя была і будзе, бывалі людзі і нелюдзі. Абставіны не заўсёды залежныя ад нас, але нашы людскія ці нялюдскія паводзіны залежныя толькі ад нас". „Асцерагаймася нелюдзяў, але яшчэ больш асцерагаймася, каб самі імі не стаць". „Трэба сабе прысягнуць не выклікаць плачу ніводнага дзіцяці, ні гора ніводнай пажылой жанчыны толькі таму, што яны іншай рэлігіі ці нацыі". „Царква павінна весці людзей да міру, адзінства і згоды". „Косава гэта не толькі тэрыторыя, гэта таксама наша духоўнасць".

Папраўдзе, ён не хацеў быць патрыярхам, яго абралі насуперак ягонай стрыманасці: „Падпарадкоўваюся вашаму выбару і спадзяюся што Бог дапаможа сваёй Царкве, а я не ўчыню нічога благога", — гаварыў ён сіноду пасля ягонага абрання. Медыі найбольш любілі паказваць, калі ён ездзіў на трамваі звычайным пасажырам, а не на адмысловай шыкарнай машыне. „Мільёны звычайных людзей жывуць у бядзе і голадзе ў той час, калі нямногія расплываюцца ў неабмежаванай бытавой і цялеснай роскашы". Мо таму, што не хацеў кідацца ў вочы, не надта яго і слухалі.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Дзіўная чарговасць

Ад нейкага часу трапляю ў гэтак званую інфармацыйную дзіру, значыць, даходзяць да мяне супярэчлівыя і няясныя інфармацыі датычныя афіцыйных візітаў высокіх рангам дзяржаўных чыноўнікаў Беларусі ў Польшчу і наадварот. Два тыдні таму ўспамінаў я аб „таямнічым" запрашэнні міністра культуры РБ Паўла Латушкі, падобна накіраваным міністру культуры і нацыянальнай спадчыны РП Багдану Здраеўскаму, наконт ягонага візіту ў Мінск. Гэтае запрашэнне — незалежна ад паведамлення міністра Латушкі, зробленага ў Беластоку ў канцы кастрычніка — да моманту пісання гэтага тэксту — у МКіНС не дайшло, што тлумачыў польскі пасол у Мінску. Некалькі дзён пасля таго, калі пісаў я аб гэтым запрашэнні, адна з агульнапольскіх газет інфармавала аб іншым візіце: „Шэф адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей 5 лістапада наведае Польшчу па запрашэнню канцылярыі прэм'ера". Прыведзена было ў гэтым кантэксце выказванне прэс-сакратара МЗС у Варшаве Пятра Пашкоўскага, які прызнаўся, што тады, калі газета аб гэтым напісала, не было яшчэ поўнай праграмы візіту, але паводле інфарматараў газеты, размовы Уладзіміра Макея ў Польшчы мелі служыць „збліжэнню Беларусі да ЕС ды паляпшэнню двухбаковых адносін з Польшчай" і датычыць м.ін. супрацоўніцтва ўнутраных служб і войска. Чакаў я гэтага візіту, бо быў бы гэта за апошнія гады візіт найвышэйшага рангам прадстаўніка адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі. Уладзімір Макей у Польшчы, аднак, не паявіўся. Нарвалася на мае вочы выказванне прэс-сакратара Пашкоўскага, які, калі вядома ўжо было, што шэф адміністрацыі прэзідэнта не прыехаў, тлумачыў, што інфармацыю аб гэтым візіце не пацвярджае, хоць візіт магчымы, а каментаваць прэсавыя інфармацыі на гэтую тэму палітыкам нязручна. Дык адкуль паявілася дата 5 лістапада і іншыя ранейшыя інфармацыі на гэтую тэму? Пры нагодзе неадбыўшагася візіту Уладзіміра Макея аказалася — як сказаў Радыё Рацыя віцэ-міністр замежных спраў Анджэй Крэмэр — што міністр Радаслаў Сікорскі запрасіў у Варшаву свайго беларускага калегу Сяргея Мартынава. Месяц раней гаварыў аб тым прыездзе „Ніве" першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. Згодна з яго прадказаннем, магло б да яго дайсці ў лістападзе (каля 20 лістапада). Пасля таго, што я пачуў па Радыё Рацыя, спрабаваў у польскім МЗС удакладніць нейкія дэталі, асабліва што віцэ-прэм'ер Сямашка казаў, што ў час пабыўкі міністра Мартынава будзе падпісана польска-беларуская дамова аб малым памежным руху.

Вось што я пачуў у мінулую пятніцу ад міністэрскага асістэнта Гжэгажа Япкевіча:

— У справе дамовы працягваюцца яшчэ ўзгадненні [13 кастрычніка віцэміністр замежных спраў Ежы Баркоўскі ў Беластоку заявіў, што ўзгадненні ўжо завершаны, па-за тэхнічнымі дэталямі і дамова адобрана ЕС — М. Х.].

Тры гадзіны пазней, пасля міжміністэрскіх кансультацый, міністэрскі асістэнт прыслаў мне мейл: „(...) пакуль справа візіту пана Міністра Сяргея Мартынава ў Варшаву з'яўляецца таксама прадметам двухбаковых узгадненняў, таксама зарана, каб выказвацца наконт чысла гэтага візіту".

Замяшанне, хочацца мне верыць, толькі інфармацыйнага характару, у справе візітаў Уладзіміра Макея, Сяргея Мартынава і Паўла Латушкі ўкладваецца ў нейкую дзіўную чарговасць. Не хачу аднак з гэтага выводзіць нейкіх далёка ідучых меркаванняў, таму што не з'яўляюся прыхільнікам тэорыі загавора сучаснай гісторыі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Была княгіня Ануся

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Сыходжу з аўтобуса на прыпынку ў Малой Турне і разглядаюся, як зайсці ў суседнюю Вялікую Турну. Паміж гэтымі дзвюма блізкімі вёскамі працякае рэчка Каменка, якой рэчышча пазначана высокімі набярэжнымі дрэвамі. На карце ад Малой Турны ў Вялікую пазначана палявая дарога, якая пачынаецца з прадаўжэння вуліцы першай з гэтых вёсак за рэчку; але мастка на той карце не відаць. Усё ж такі іду ў тым напрамку, спадзяючыся знайсці нейкае станоўчае рашэнне, але бачу, што прадаўжэнне згаданай вуліцы ў напрамку ракі перагароджана... Пытаю двух мужчын, што па вуліцы Малой Турны нясуць рамонтныя прыборы, як трапіць у суседнюю вёску. Яны мяне інфармуюць, што трэба мне вярнуцца па шашы ў напрамку Сямятыч, да лагоднага павароту асфальтоўкі, а там, перад агароджай, будзе сцежка да кладкі, якая выходзіць на вуліцу ў Вялікай Турне. А тое месца, у якое я так накіраваўся — балоцістае; значыць, там нейкая разнавіднасць броду.

Вуліца ў Вялікай Турне брукаваная, у восеньскі дзень на ёй амаль пуста, бо чалавечых постацей не відаць. Пабачыць затое можна сабак, курэй, часам катоў. Не чуваць таксама ні голасу, ні паху буйнейшай жывёлы. У вёсцы шмат вялікіх дамоў, на панадворках відаць і традыцыйныя сельскагаспадарчыя збудаванні, але на панадворкавай траўцы не відаць земляробчага руху, а за вёскай малады лес, пасаджаны ў розныя пасляваенныя поры. Цалкам магчыма, што мясцовае падрастаючае пакаленне падалося ў вонкавы свет і звіло свае гняздзечкі па-за роднай Турнай — мо ў Сямятычах, мо ў Седльцах, мо ў Варшаве. А яшчэ ж і граніцы адкрылі, напрыклад, у Бельгію. Цалкам магчыма, што за заробленыя ў свеце грошы некаторыя вяскоўцы здзейснілі свае мары — пабудавалі ў роднай вёсцы створаныя ў марах прасторныя дамы, у якіх цяпер ціхаціха...

Але гэта ў асенні дзень, бо ж відаць, што вёска жыве. Крама ёсць, акурат была ў „мой" час закрыта, але тавар усярэдзіне відаць. З другога боку вуліцы невялікая мураванка пункту прыёму малака, пабудаваная не малочным кааператывам, але самімі сялянамі; перад ёю наезджаныя сляды машын. Гэтая мураванка стаіць на грамадскім пляцы, на якім дрэмле стары драўляны будынак, які падаецца мне колішняй школай; вакол гэтага будынка слядоў частай чалавечай прысутнасці не відаць. У вёсцы і на яе канцы некалькі крыжоў розных канфесій, бо ж на Пабужжа сцякаліся людзі з розных напрамкаў, прыносячы з сабою свае светаўспрыманні. І хаця ў розныя эпохі былі спробы перахрышчваць іх на розны лад, аднак тыя спробы не былі даведзены да канца: адных перахрысцілі, іншых недаперахрысцілі, і так асталося...

Ад Вялікай Турны на карце пазначана дарога ў Анусін, але на месцы яе выразна не відаць, таму выходжу на шашу ў бок Радзілаўкі. І неўзабаве заўважаю непаладёк ад яе антрапагенныя горкі. Падаюся ў іх напрамку, пераходжу на другі іх бок і перада мною раскрываецца неспадзяваная панарама. Там агромная капальня жвіру, які падымаюць стужкавыя канвееры. А яшчэ ніжэй, у абшырных вадаёмах з вадой, плаваюць драгі, якія дастаюць той жвір нават з-пад вады. Краявід там такі, быццам з каляровых рэкламных турыстычных буклетаў нейкай краіны блакітных азёр...

Даваенныя крыжы ў полі за Алендрамі

Даходжу да Анусіна. „Свой радавод пачынае сённяшні Анусін ад славутай уладальніцы горада Сямятыч і ўсяго іх наваколля — Анны Ябланоўскай (1728-1800 гг.). Яна правяла ў сваіх маёмасцях шэраг прагрэсіўных як на тыя часы рэформ, што садзейнічалі ўздыму гаспадаркі і павелічэнню яе даходаў. На месцы сённяшняга Анусіна заснавала фальварак, якога спецыяльнасцю была гадоўля быдла ды гарэлачны бровар. (...) Фальварку Ябланоўская дала назву, выведзеную ад свайго імя: Анусін — інакш уласнасць Анны. Пасля смерці А. Ябланоўскай Анусін пераходзіў з рук у рукі розных уладальнікаў, і, урэшце, недзе ў першай чвэрці дваццатага стагоддзя быў падзелены на рэзкі і распрададзены сялянам. (...) З году ў год у вёсцы паяўлялася нешта новае: школа, электрычнасць, крама, злеўня, прыстанак ПКСу, тэлефон. Пачалі расці новыя сучасныя мураваныя дамы, клуні, хлявы, прыбывала сельскагаспадарчых машын, моладзь рушыла ў сярэднія і вышэйшыя школы. Пры належным доглядзе меліяраванае Балота стала дасканалай сенажаццю і пашай; на палях ураджаі падвоіліся", — пісаў Мікола Гайдук у „Ніве" ад 16 лютага 1975 года. Так было амаль трыццаць пяць гадоў таму. Цяпер вакол Анусіна на ўраджайныя калісь палі наступае лес, крыху раллі і аблагоў яшчэ захавалася. У вёсцы не відаць ні школы, ні крамы, ні злеўні. Затое сучасных мураванак вельмі многа і выглядаюць яны вельмі багата. Не ўдалося мне з нікім паразмаўляць, запытаць, хто ў тых палацах жыве — ці гэта мясцовыя людзі, ці мо нейкія былыя багатыя гараджане, якія пасяліліся ў гэтую ціхую вёску на восень свайго жыцця, выводзячы Анусін у ранг асаблівага асяродка для пажылых...

На абодвух канцах Анусіна ёсць два панадворкі з калекцыямі пад адкрытым небам: з боку шашы адзін панадворак займаюць дэмбельныя аўтамабілі, бліжэй другога канца вёскі ёсць панадворак з экспанатамі рознай сельскагаспадарчай тэхнікі. Прайшоўся я па адной толькі вуліцы Анусіна — па той, што адыходзіць ад шашы і па ёй заўважыў толькі адзін панадворак, якога гаспадар абрабляе зямлю, займаецца прадукцыяй малака, у яго студзільнік. Па другой вуліцы, перпендыкулярнай да першай, я не хадзіў, магчыма, што і там стаяць дамы для насалоды спелым жыццём.

Дарога з Анусіна ў Алендры жвіровая, пралягае яна паміж паш і сенажацей; запушчаных палеткаў там няма. Алендры выклікалі ў мяне сумнае ўражанне; мо было б інакш, калі б я трапіў туды не з Анусіна. Бо паміж гэтымі вёскамі відаць кантраст. Мо менш важны насціл вуліцы, які ў Анусіне асфальтавы, а ў Алендрах ляжыць жвір з ухабінамі. Ды і хаты ў Алендрах ніякаватыя — там толькі адзін большы дом, пры канцы вёскі з боку чыгуначнай лініі, гаспадар там займаецца малочнай прадукцыяй.

Пра мінулае вёскі звярнуся зноў да Міколы Гайдука: „Легенда кажа, што А. Ябланоўская пасяліла тут выхадцаў з Галандыі і ад іх вёска займела назву Галендры, якая потым прыняла сучасную форму Алендры. Больш праўдападобным бадай будзе меркаванне, што А. Ябланоўская пасяліла тут падданых са сваіх уладанняў Гайбуды, што каля Гданьска, абавязваючы іх будаваць судны і займацца перавозам розных прадуктаў (збожжа, смалы, дзёгцю, паташу і іншых) у Гданьск, а адтуль прывозіць розныя вырабы, якія былі неабходны для яе гаспадаркі, пастаўленай на высокім узроўні як на тыя часы. Вядома ж, што ўладальніца Сямятыч трымала на Бугу значны рачны флот. У памяці старажылаў Алендраў захавалася звестка, што каля вёскі калісьці была бяндзюга (месца звозкі бярвенняў і нарыхтоўкі іх да воднага транспарту — А. В.). Карысталіся ёю яшчэ ў першай палове нашага (значыць дваццатага — А. В.) стагоддзя пры сплаве дрэва. Звозілі яго зімою з Траянаў, Кадлубы, Правалы, а гават ад Нурца і Гродзіска, вясною ж сплаўлялі яго ўніз па Бугу і Вісле". Вось куды дзелася магутная калісь Мельніцкая пушча!

У канцы Алендраў, што ад чыгуначнага моста на лініі Чаромха — Седльцы, стаіць двухканфесійны помнік з выявамі Чанстахоўскай Мадонны і Пантакратара, пастаўлены ў юбілейным 2000 годзе. Унізе інфармацыя, што там пакоіцца ляснічыха Ванда, якая загінула ў вайну 1939 года. Невядома, у якіх абставінах, ад каго яна загінула. У верасні 1939 года былі нямецкія налёты на чыгуначны мост, што побач Алендраў, але бомбы падалі ў ваду і навакольныя жыхары маглі аблавіцца глушанай іх выбухамі рыбай...

Каля паўкіламетра ад Алендраў у бок сямятыцкай чыгуначнай станцыі стаіць магутны бетонны корпус аднаго з пунктаў г.зв. Лініі Молатава. Аднак у розных матэрыялах, у тым ліку і друкаваных у 1981 годзе ў „Ніве" рэпартажах Віктара Рудчыка, няма згадкі пра „точкі" пад Алендрамі; мова там пра баі каля суседняга Анусіна. У чым жа справа? А справа ў тым, што Алендры, якія распаложаны побач Буга, былі ў савецкі перыяд выселены, а нашы аўтары не маглі пра такія савецкія „дабрадзействы" згадваць. Праўда, Міколу Гайдуку ўдалося ў той час працінуць між радкамі адно інфармацыю, што Анусіна ў савецкі час не высялілі. Магчыма, што ў той глыбе бетону каля Алендраў і адбываліся падзеі, апісаныя ў савецкім зборніку „Буг в огне" саветкай Пелагеяй Сулейкінай, а пасля паўтораныя Рудчыкам у „Ніве". Пра ідэалагічны ціск на змест успамінаў хай сведчыць такі вось абзац з Сулейкінай, калі яна прыводзіць апошнія словы свайго мужа: „Береги детей до последней минуты, как бы трудно ни было. Если останетесь живы, постарайся воспитать детей достойными своей Родины! Будь уверена, партия поможет вырастить их"; пра дзяцей клапаціўся, але і пра партыю нельга было забыць!

Сляды савецкага партыйнага гаспадарання захаваліся каля Алендраў да сёння, насупраць згаданага толькі што бункера. Цераз ростань дарог ад яго стаяць там сёння два крыжы. На адным з іх, шэрага колеру, кірылічны малітоўны надпіс з датай 1914 года. На ягоным пастаменце бетонны крыж у гняздзе з трэшчынай, але знізу абаперты каваны крыж жалезны. Другі крыж памаляваны на карычнева-шакаладны колер і ніякага надпісу на ім няма. Так выглядае карціна з воддалі. Але калі прыгледзецца тым крыжам дакладна, тады можа на іх заўважыць сляды ранейшых надпісаў! Пад карычневай фарбай удалося мне прачытаць словы „głodu" і „zachowaj". І пад шэрай „кірылічнай" фарбай ёсць ранейшы надпіс, з якога, на жаль, ужо не ўдалося мне прачытаць ніводнага слова. Відаць савецкія паклоннікі партыі, выселіўшы мясцовых вяскоўцаў, рашылі расправіцца і з іхняй запісанай у бетоне малітвай, разбіўшы тыя крыжы. Калі людзі вярнуліся ў сваю вёску, яны сабралі знявечаныя свае ахвяры, зляпілі іх, папоўнілі, памалявалі, на адным з помнікаў напісалі новы тэкст...

Згаданы бункер стаіць сярод абрабляемага поля. Крыху далей, мо за дзвесце-трыста метраў, стаіць чарговы бункер, гэты ўжо аброс хваінай. Яшчэ адзін стаіць перад чыгуначнай станцыяй Сямятычы, сярод ворыва. І каля Анусіна ёсць яны, але ўжо схаваныя ў лесе.

Дзень сеніёра

Як штогод, так і сёлета Гмінны асяродак сацыяльнай дапамогі (ГАСД) у Чаромсе супольна з Гмінным асяродкам культуры арганізавалі Дзень сеніёра. У гэтым годзе мерапрыемства адбылося 25 кастрычніка. Хоць арганізатары задбалі пра рэкламу, аднак прысутнасць не была такой як у мінулым годзе. Не ўдзельнічалі ні прадстаўнікі ваяводскіх улад Саюза польскіх пенсіянераў, ні чыгуначных устаноў. Затое сабралася свойская кампанія пенсіянераў з навакольных вёсак — Чаромхі (станцыі і вёскі), Ставішчаў, Вулькі-Тэрахоўскай, Кузавы, Бэрэзышчаў, Баброўкі і Пагулянкі — на чале з праваслаўным і каталіцкім святарамі.

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Войт Міхал Врублеўскі прывітаў удзельнікаў сустрэчы і гасцей, а затым пазнаёміў прысутных з дзейнасцю ГАСД. Пасля старшыня пенсіянерскай арганізацыі Юзэф Дубковіч зачытаў прозвішчы актыўных дзеячаў прафсаюзнай арганізацыі, якім былі ўручаны ганаровыя значкі. Пасля афіцыйнай часткі святары прапанавалі згаварыць малітву і блаславілі пачастунак. Застолле было дасканала падрыхтаванае працаўнікамі ГАСД, а сталы ўгіналіся ад бутэрбродаў і смакоцяў. Была традыцыйная чарка віна і шмат тостаў. А публіку весялілі чаромхаўскія музыканты Радаслаў Верамчук і Роберт Іганскі. Гучалі дыскаполавыя мелодыі ў перамешку з народнымі песнямі. А важакамі ў гэтай справе былі спявачкі з Чаромхі-Вёскі і Вулькі-Тэрахоўскай, хоць і апошнія ўдзельнікі не заставаліся ззаду. На ўвагу заслугоўвае факт, што ў імпрэзе ўдзельнічала здымачная брыгада Гродзенскага тэлебачання і наша рэдакцыйная сяброўка Міра Лукша, якія гасцявалі ў Кузаве. Я, карыстаючыся нагодай, рэкамендаваў ім заглянуць на святочную імпрэзу. І, праўду сказаўшы, сёлетні Дзень сеніёра ў Чаромсе быў удалым мерапрыемствам. За гэта арганізатарам належыцца шчырае дзякуй!

Звярына на дарозе

Па дарозе з Гайнаўкі ў Белавежу шафёры могуць сустрэць лясную звярыну. Пераканаўся аб гэтым 22 кастрычніка жыхар Белавежы, які ехаў у Гайнаўку. Нечакана пад аўтамабіль ускочыў малады зубронак. Шафёр не паспеў спыніць машыну. Зубронак загінуў на месцы. Дзякуючы шчаслівым абставінам, шафёру нічога не сталася, апрача таго, што зламалася пярэдняя частка аўтамабіля. Звярыну прыбралі працаўнікі Белавежскага нацыянальнага парку. Гэта другое такое здарэнне на Гайнаўшчыне. Паліцыя заклікае шафёраў да разважлівай язды асабліва там, дзе крыжуюцца дарогі са шляхамі да месц жыравання звярыны. Варта памятаць, што звярына найчасцей корміцца ранкам і позднім паабеднім часам.

(ус)

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

У Пунску пад бел-чырвона-белым сцягам

— Запрашаем да нас часцей! — кідаюць на развітанне жыхары Пунска, ненасычаныя толькі двухгадзінным канцэртам, які завяршыў XVI Сустрэчы нацыянальных меншасцей.

Шчыра кажучы, хочацца там вяртацца. Можа літоўцы і беларусы не заўсёды дагаворваліся, але зараз, як нацыянальныя меншасці ў Польшчы, маем шмат супольнага. Нягледзячы на вялікія розніцы між мовамі, варта зараз гаварыць адным голасам. Літоўцы ўжо вітаюць прыезджых указальнікам „Puńsk Punskas", усюды гавораць па-літоўску, а большасць дзяцей свабодны час праводзіць у гуртках і калектывах у школах ды ў Доме літоўскай культуры.

— Гэта вынікае з характару гэтага народа. Жывем у Польшчы 90 гадоў і ўвесь час хочам захаваць сваю мову і тоеснасць, — тлумачыць дырэктар дома культуры Аста Пячуліс.

— Кожная меншасць мае падобныя мэты, прынамсі павінна мець.

— Так, але ў нашым выпадку неяк так атрымліваецца, што баронімся перад моўнай асіміляцыяй, з якой змагаюцца іншыя. Напэўна дапамагаюць нам школы, у якіх можам вучыць усіх прадметаў на літоўскай мове.

Пунск налічвае каля 1200 жыхароў. Здавалася б, невялічкая гмінная мясцовасць не дае большых магчымасцей чым іншыя, але ўжо сам факт знаходжання тут літоўскага ліцэя дае зусім новае ўяўленне пра лакальнае жыццё, якое ў культурным плане ў асноўным арганізуе Дом літоўскай культуры.

— У Пунску маем яшчэ Цэнтр літоўскай культуры, пры якім працуюць тры фальклорныя калектывы, — дадае Аста Пячуліс. — Маем школы, а ў кожнай з іх працуюць рознага роду калектывы і гурткі. У нашым Доме літоўскай культуры маем восем гуртоў і якраз тут мастацкай дзейнасцю займаецца каля 350 асоб. Амаль 250 гэта дзеці і моладзь

Трэцяя частка дзяцей, якія вучацца ў літоўскіх школах, ангажуецца ў культурны рух у гміне Пунск. Гэта толькі паводле мераў дырэктар Дома літоўскай культуры, якая пералічвае свае актыўныя адзінкі. Трэба ўзяць пад увагу таксама школьную дзейнасць, бо там мастацкае жыццё плыве сваім асобным рэчышчам і ахоплівае чарговых маладых людзей. Гэта незвычайная з'ява, калі глядзець на сучасных дзяцей і моладзь, не толькі ў меншасных асяроддзях. Свет маладых вельмі часта фармуюць медыі, каляровыя часопісы, камп'ютарныя гульні і г.д.

— Часам цешуся, што ў нашым невялічкім Пунску няма іншай альтэрнатывы чым Дом літоўскай культуры, — з усмешкай гаворыць спадарыня дырэктар. — Ёсць спартыўная зала, таму і вынікі па спорце ў нас нядрэнныя, але канкурэнцыю спорту складае толькі культурнае жыццё нашай меншасці.

— Мае дзеці яшчэ малыя, але напэўна будуць хадзіць на заняткі ў будучыні, — гаворыць жанчына з публікі, якую я затрымала пасля канцэрта.

— Хапае вам прапаноў? — дапытваюся.

— Безумоўна. Можна тут рабіць, што заўгодна: танцы, спевы, гульні.

Аста Пячуліс:

— Без бацькоў мы так добра не функцыянавалі б. Яны разумеюць, што дзяцей да розных форм культуры трэба прывучаць. Калі прывыкаюць з наймалодшых гадоў, тады і цяжка ім пазней гэта пакінуць, выбіраюць культурную дзейнасць як свой шлях.

Бацькоў расхвальвае не толькі дырэктар Пячуліс, але таксама войт Пунскай гміны Вітаўт Лішкоўскі.

— Маем проста мудрых бацькоў, а дзякуючы таму і мудрых дзяцей. Наша пакаленне яшчэ саромелася свайго, але нашы дзеці роднага ўжо не цураюцца. Не бачна ў іх комплексаў непаўнацэннасці. Гэта цешыць. Гляньце, усе гавораць на літоўскай мове. Ніхто іх не прымушае.

Калі пытаюся ў Доме літоўскай культуры пра найбольшыя поспехі, чую, што самая колькасць наведвальнікаў дома з'яўляецца найбольшым і самым важным дасягненнем.

— Дзякуем Богу, што пакуль нашым дзецям хапае прапаноў. Пакуль што, большых магчымасцей у нас няма, але ахвотна ахвяравалі б мы дзецям больш.

Культурнае жыццё спасцігаюць розныя крызісы, калі ідзе пра нацыянальную культуру, танцы, спевы, фальклор. Тут таксама паяўляецца крызіс падлеткаў, якія шукаюць для сябе новых форм або ўцякаюць ад ранейшых заняткаў. Гэты бунт не абмінае і мясцовага дома культуры.

— Бывае так, што дзеці перастаюць цікавіцца, але гэта адзіночныя выпадкі. Помню такі момант, калі група гімназістаў сказала, што не хоча ўжо танцаваць, патрабуе адпачынку. Я сказала, што разумею, адпусціла на два гады. Але раней яны мне паабяцалі, што ў ліцэі да танцаў вернуцца. Вярнуліся. З усмешкай, новай энергіяй. Нават не трэба ім было прыпамінаць.

— Дзяцей цягне на сцэну, да выступаў, — падкрэслівае войт. — Бачу гэта не толькі па сваіх дзецях. Ацэньваю па колькасці ахвотных удзельнічаць у мастацкім руху. Калі так ёсць, то няма чаго баяцца за будучыню нашай культуры.

Самадзейнасць на Пуншчыне рэалізуецца перад усім дзякуючы шматлікім нагодам для выступленняў. Кожны год у гміне адбываецца каля васьмідзесяці мерапрыемстваў, розных маштабаў і формаў. У вольнай Польшчы якраз у Пунску з'явілася думка ладзіць сустрэчы з іншымі меншасцямі, асабліва таму, што ў паўночна-ўсходняй Польшчы пражывае іх шмат. Ідэю прыдумала ў 1994 годзе Юрата Кардоўская, тагачасны дырэктар мясцовага дома культуры. Працягвае яе поўная энергіі Аста Пячуліс.

— З самага пачатку сустрэчы трывалі тры дні, былі багацейшымі ў выстаўкі, рукадзелле. У пятніцу, скажам, выступалі эстрадныя гурты, у суботу — хары, у нядзелю прэзентаваліся іншыя віды мастацтва. Вельмі розныя формы.

На сцэне ў Пунску прэзентуюцца шматлікія гурты. Сёлета арганізатары запрасілі прадстаўнікоў беларускай, украінскай, нямецкай і расейскай меншасцей, але трэба сказаць, што супольная гісторыя беларускага і літоўскага народаў адлюстроўваецца таксама ў сімпатыі для беларускіх выканаўцаў. У першы дзень XVI Фестывалю „Сустрэчы" прэзентаваліся бяльшчане — гурты „Капрыс", „Вясёлка", „Світанак" і „Світаначак". Другога дня публіку падарвала бельская „Маланка" і беластоцкая Студыя фальклору Аб'яднання АБ-БА, не толькі дзеці, але і дарослая група. Трэба дадаць, што беларускія дзеці чарговы раз выступілі супольна са сваімі літоўскімі сябрамі, з якімі рыхтавалі праект „Вялікае Княства Літоўскае — супольная спадчына".

— Наша публіка ўжо выхаваная, — ганарыцца дырэктар. — Людзі ўжо адрозніваюць мовы іншых нацый, ведаюць, калі выступаюць украінцы, калі беларусы. Ведаюць таксама чаго спадзявацца, таму так верна да нас вяртаюцца і цёпла ўспрымаюць гасцей.

Выступы атрымаліся паспяховымі. Аказваецца, што і беларусам ёсць чым пахваліцца. За цану вывешвання чырвона-зялёнага сцяга не трэба абавязкова прывозіць вялікіх калектываў з Мінска. У Пунску над галовамі выканаўцаў ад фону вельмі выразна адмяжоўваўся бел-чырвона-белы сцяг.

— Некаторыя пыталіся, што гэта за сцяг. Я ганарліва адказвала: „Як гэта? Беларускі!", — смяецца Аста Пячуліс, можна сказаць, вялікі сябра беларусаў.

На жаль, гэта ўжо другі год, калі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі адмаўляецца ад фінансавай падтрымкі „Сустрэч".

— Нібыта па фінансавых прычынах, — кажа Аста.

— Цяжка мне сказаць, чаму ад такой ініцыятывы адмаўляецца міністэрства, — дадае войт. — Можа мы, меншасці, павінны кожны паасобку напісаць па маленькім праекце і проста суфінансаваць гэтую ідэю. Можа тады гэта ім падышло б.

Пасля хароў, аркестраў і танцавальных гурткоў, ужо на завяршэнне, на сцэну выйшаў невялічкі мужчына. Цямнейшы колер скуры указваў на чалавека з адлеглых краін. У руках трымаў ён чырвона-залатую кнігу.

— А на канец у пару словах пра татарскую меншасць, якая пражывае сярод літоўцаў, распавядзе яе прадстаўнік, — прагучала са сцэны.

Фактычна, пару сказаў хапіла, каб татары адзначылі сваю прысутнасць на сустрэчах у Пунску. Адзін з беларусаў жартоўна-іранічна падвёў гэтую прэзентацыю:

— Каб праз 50 гадоў не было так, што такім самым чынам будуць запрашаць на сцэну прадстаўніка беларускай меншасці.

Хочацца сказаць, усё ў нашых руках.

Алег Жугжда ў БЛТ

У Беластоцкім лялечным тэатры ўжо на паўдарогі рэпетыцыі „Папялушкі" ў рэжысуры Алега Жугжды, мастацкага дырэктара Гродзенскага абласнога лялечнага тэатра

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Будзе гэта спектакль аб магчымасці здзяйснення жаданняў. Трэба верыць, што ўсё, што добрае — перад намі і зрэалізуецца. Добрых людзей шмат і часам, як у нашай казцы, сустракаем іх на сваім шляху, — сказаў „Ніве" гродзенскі рэжысёр.

У пастаноўцы возьме ўдзел трынаццаць беластоцкіх акцёраў. Сцэнічнае афармленне падрыхтавалі таксама беларусы: Надзея Якаўлева і Валерый Рачкоўскі. Народжаны ў Вільні Алег Жугжда (1961 г.) — выпускнік факультэта рэжысуры Вышэйшай тэатральнай школы ў Санкт-Пецярбургу і Беларускай тэатральна-мастацкай акадэміі ў Мінску. З'яўляецца ён таксама акцёрам, сцэнічным афарміцелем і драматургам. У Гродне працуе і ў лялечным, і ў драматычным тэатрах. Працаваў таксама за мяжой, напрыклад, у Польшчы паставіў знакамітую шэкспіраўскую „Зімовую казку" ў Балтыйскай оперы ў Гданьску ці лялечную пантаміму „Цырк" у Слупску. Называюць яго піянерам лялечных тэхнік і эксперыментатарам, які прымяняе разнародныя сродкі выразу, выкарыстоўваючы апрача лялек таксама маскі і прысутнасць акцёраў у г.зв. жывым плане.

„Папялушка" ў БЛТ гэта аўтарская версія вядомай казкі. Калі мы зайшлі ў БЛТ, рэпетыцыі працягваліся ў адным з памяшканняў тэатра, званым „акварыумам". Рэжысёр пераконваў акцёраў да сваёй канцэпцыі сілай спакою, без нервовасці, якая часта спадарожнічае іншым творцам пры канструяванні прадстаўлення. У перапынку паставілі мы яму пару пытанняў.

— У якой стылістыцы, канвенцыі будзе Ваша „Папялушка"?

— Наш спектакль будзе ўтрыманы ў канвенцыі тэатра ў тэатры. Аповед пра „Папялушку" адбываецца на пачатку мінулага стагоддзя і гэта само ўжо для дзяцей з'яўляецца казкай. Акцёры ў жывым плане прымаюць удзел у навагоднім балі 1920-1930 гадоў у гатэлі „Excelsior", у якім дзяўчынка засынае і ёй якраз сніцца Папялушка. Удзельнікі балю змяняюцца ў казачныя постасці: мачаху, сясцёр і прынца.

— Якія ўмовы мастацкай працы ў польскіх і беларускіх лялечных тэатрах?

— У наш складаны час у Польшчы вельмі прыемна быць рэжысёрам спектакляў. Працуюць тут вялікія прафесіяналы, фактычна поўнасцю адданыя сваёй прафесіі. У польскім тэатры на працу можна прыязджаць амаль як у адпачынак. У нас яшчэ ад савецкага часу ўсё працягваецца барацьба за кожны спектакль. Усё трэба інтэнсіўна думаць амаль аб усім, каб спектакль мог узнікнуць, безупынна барукацца з нейкімі творча непатрэбнымі высілкамі. Умовы працы ў тэатры ў нас неідэальныя, і, як дагэтуль, нерэфармавальныя.

— А ў плане мастацкіх адрозненняў — чым адрозніваюцца гэтак званыя лялечныя школы ў Польшчы і ў Беларусі?

— Асновы працы такія самыя: праца з прадметам, праца з целам, прымяненне метадаў працы з акцёрам і над спектаклем згодна са школай Станіслаўскага. У Польшчы гэтая сістэма ідзе крыху далей, у напрамку пошукаў пэўных новых форм выражэння, пошукаў новых тэхналогій, між іншым віртуальных сродкаў выразу з выкарыстаннем мультымедыяў. Асноўным адрозненнем з'яўляецца тое, што вынікае з факта, што нашы акцёры вельмі мала зарабляюць у тэатрах і іх асноўная прафесія змяняецца ў хобі. Гэта вельмі сумнае. Практычна з гэтай прафесіі немагчыма выжыць. У Польшчы стваральнікі тэатра маюць больш магчымасцей зрэалізавацца ў прафесіі, хоць бы па прычыне фінансаў, прынамсі ў параўнанні з намі. Пасля распаду СССР і ў эканамічнай сітуацыі, якая ўзнікла, вельмі шмат асоб адышло з прафесіі таксама ў Беларусі. З майго курса на рэжысуры ў Пецярбургу адышла з прафесіі адна трэць.

— Як ацэньваеце культурную палітыку Беларусі ў апошнія месяцы, у час новага міністра культуры Паўла Латушкі?

— Пакуль мы ў чаканні змен. У лепшы бок, вядома. Чакаем, што дзяржава зверне большую ўвагу на тэатр. Не маем да гэтай пары ад шмат гадоў прынятага тэатральнага закону, які дазволіў бы ўнармаваць эканамічны статус тэатраў, зрабіць яго лягчэйшым. Сёння патрабаванні ў адносінах да нас такія самыя, як да прадпрыемстваў, якія мусяць на сябе зарабіць і плаціць такія самыя падаткі. А тэатр гэта не прадпрыемства культуры, толькі аб'ект мастацтва. Паколькі дзяржава займаецца ідэалогіяй мастацтваў, між іншым тэатр як найбольш упісваецца ў гэтую палітыку, можа „несці дзяржаўную ідэалогію масам". Акцёр, рэжысёр не можа ўсё думаць дзе і як зарабіць дадатковую капейку, каб пражыць. Кажуць, мастацтва павінна быць галоднае, але ж не да такога ўзроўню! Мабыць, мастацтва не павінна быць сытым, але ж і негалодным.

— У якой сітуацыі знаходзіцца Гродзенскі абласны лялечны тэатр?

— Я лічу, што сёння гэта адзін з самых моцных лялечных тэатраў у Беларусі, адна з найбольшых і стабільных тэатральных груп. Займаецца ў нас 22 акцёраў і гэта большы тэатральны калектыў, чым у Дзяржаўным лялечным тэатры ў Мінску. Цешыць, што ахвотна прыходзяць на працу ў нашым калектыве маладыя людзі. Цьфу, цьфу, пакуль усё ў парадку!

— Як з беларускай мовай у тэатрах Беларусі?

— Калісь, за савецкім часам, быў абавязак пастановак спектакляў на беларускай і рускай мовах папалам. Калі Беларусь стала незалежнай краінай, пачалі гвалтоўна ўсе п'есы перакладаць на беларускую мову. З гадамі гэты працэс стаў знікаць. Цяпер гаворка аб фінансавай рэнтабельнасці тэатраў, таму галоўным чынам ставім па-руску, прычым беларускіх аўтараў, так для дарослых, як і для дзяцей, прэзентуем па-беларуску. Калі, напрыклад, ставім Сяргея Кавалёва, які піша выключна па-беларуску, дык ставім яго, вядома, па-беларуску.

— У адным з інтэрв'ю сказалі Вы, што блізкая Вам ідэя сінтэтычнага тэатра. Што гэта значыць?

— Значыць гэта тое, што сілы на падрыхтоўку спектакля для дарослых і дзяцей трацяцца такія самыя, таго самога патрабуецца ад акцёраў. Трэба паважаць мастацтва і нельга меркаваць, што з меншай адданасцю можна рыхтаваць спектакль для дзяцей. Стараюся ставіць спектаклі для дзяцей так, каб маглі іх глядзець цэлыя сем'і, каб пасля маглі дома аб іх паразмаўляць. Дзіця не можа бачыць толькі таго, што мы хочам. Павінна прымяняць сваё светабачанне.

— Што абазначае „выхоўваць дзіця шляхам тэатра"?

— Гэтае паняцце функцыянуе ў нас здаўна, калі ў Расіі стаў дзейнічаць тэатр для дзяцей Сяргея Абразцова, які хацеў, каб тэатр браў на сябе ідэалагічную частку выхавання. Дзяцей, аднак, трэба выхоўваць перш за ўсё самім мастацтвам.

Прэм'ера „Папялушкі" ў рэжысуры Алега Жугжды прадбачана на 5 снежня 2009 г.

Змены ў КРУС

Пра змены ў дзейнасці КРУСу гаварылася ў медыях ад некалькіх гадоў, але толькі 24 красавіка 2009 года былі ўведзены некаторыя змены. Тыя грамадзяне, што аплачваюць ЗУСаўскія складчыны сацыяльнага страхавання, падкрэсліваюць кантраст сваіх штомесячных высокіх узносаў з квартальнымі невысокімі ўзносамі земляробаў. Сяляне ж традыцыйна наракалі, што яны забедныя каб плаціць нават тыя нізкія квартальныя складчыны.

30 верасня г.г. на сесіі арлянскай Гміннай рады наконт змены сельскагаспадарчага страхавання выказалася загадчыца аддзела КРУС у Бельску-Падляшскім Раіса Корсак-Бурса.

— Ведаю, што сяляне наракалі на несправядлівыя складчыны грамадскага страхавання, што закон не адпавядае патрэбам земляробаў. З 1 кастрычніка мяняюцца дэталі дзеючага ад 1 студзеня 1991 года закону. Цяпер штоквартальныя складчыны замяняюцца штомесячнымі, якія будуць налічвацца за дні (г.зн. за няпоўны месяц), а не за квартал. Таксама і памер складчыны, асабліва пенсійнай, якую складалі два кампаненты: выпадкова-хваробна-мацярынскі ды пенсійны. Першы кампанент не мяняецца, толькі другі сыходзіць з 30% асноўнай пенсіі на 10%, значыць ён будзе быццам справядліўшы і не будзе прабелаў ў страхаванні, накшталт двайнога зачэплівання таго страхавання.

Далей закон схіляецца ў напрамку абвастрэння прынцыпаў страхавання земляробчай дзейнасці. Уведзены больш строгія тэрміны падавання пасведчанняў з казначэйскіх упраў і тэрміны заявак пра гаспадарчую дзейнасць. Новы закон удакладняе прынцыпы страхоўкі тых асоб, у якіх гаспадарка меншая за пераразліковы гектар.

Намаўляю вас падпарадкавацца законнаму страхаванню, бо яно карыснейшае чым дагэтуль, але з умовай, што асоба плаціць узносы тэрмінова. Тэрміны ўзносаў квартальных складчын не памяняліся, нягледзячы на змену прынцыпаў іх налічвання, і далей канчаюцца на апошнім дні кожнага квартала.

Ёсць яшчэ адна змена, але не ведаю, ці яна закране Арлянскую гміну. Мова тут пра складчыны асоб, у якіх гаспадаркі большыя за пяцьдзесят пераразліковых гектараў (тут радныя загаманілі, што такія ёсць, нават за пяцьсот гектараў — М. М.), і з іх будзе дадатковы памер тае пенсійнае складчыны; закон уводзіць інтэрвалы 50-100 гектараў, 100-150 і г.д.

Віцэ-старшыня Рады спытаў, ці ад узбуйненай складчыны будзе пасля большая пенсія. У адказ пачуў, што новы закон не вызначае прынцыпаў налічвання пенсій; калі ўзбуйнее складчына, так як калісь у ЗУСе, то мяркую, што і пенсія будзе налічана па-іншаму.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Беларускія сваткі з Гайнаўкі

Фота Міры ЛУКШЫ

На шаснаццатым аглядзе „Беларускі абрад на сцэне” выступілі са сваёй пастаноўкай вучні, якія гуртуюцца пры пані Веры Масайла ў Гайнаўскім доме культуры. Гэта ўжо не першыня для іх і для іхніх бацькоў, якія шчыра дапамагаюць прыгожа аформіць сцэну ў традыцыйнае абсталяванне колішніх хат. На сцэне ёсць і калаўротак, і капанькі, і бочкі на капусту, і поўна вышыванак і іншага рукадзелля ды адзення. Зусім як на вёсцы — пасярод сцэны вырастае нават дрэва, ля хаты стаіць плецены з голля плот. У гэты раз маладыя акцёры паставілі вельмі рамантычную і сумную гісторыю з мінулага — „Хлеб — святая рэч”, пра няздзейсненае каханне прыгожай Олі з таленавітым і добрым, але ж бедным Яськам з сяла Корхі. Сватаецца да Олі сын багацея, бамбіза Сцяпан. Галоўны герой — хлеб, які мае прыняць або вярнуць нарачоная. Яна хлеба не верне Сцяпану... Зайгралі адмыслова! Пятро Аўксянцюк быў вядучым і бацькам Сцяпана, Паўлік Аўксянцюк — бацькам Олі, Томак Гіншт — братам Олі, Сашам, Марцін Гіншт — Сцяпанам, Юлька Гдоўская — сястрой Олі, Бартак Нічыпарук — Сцяпанам, Беата Смактуновіч — мамай Олі, Каралінка Васілюк — мамай Сцяпана, а Оля Буслоўская — Оляй ды Матэвуш Харкевіч — Яськам. Малайцы!

(лук)

Уладзімір Юрэвіч

Бярозчыны валёнкі

Насупраць дома, дзе жыве Святланка, за лета вырасла высокая камяніца. Перад ёй на скверыку саджалі ўвосень дрэўцы. Адну бярозку, самую тонкую, адкінулі.

— А гэтай не трэба вам? — спытала Святланка.

— Бяры яе сабе, калі хочаш, — сказаў вясёлы дзядзька, які са шланга паліваў дрэвы.

Святланка прынесла бярозку ў свой двор. Тата якраз быў дома. Дзяўчынка папрасіла яго пасадзіць дрэўца.

Тата доўга трымаў тую бярозку, перабіраў пальцамі карэньчыкі і нешта думаў. Потым выкапаў ямку. Святланка прынесла з клумбы чарназёму, пасадзілі дрэўца, палілі.

— Можа і прымецца, — сказаў тата.

З кожным днём станавілася ўсё халадней і халадней.

— А бярозка ўзімку не змерзне? Яна ж голенькая, — трывожылася Святланка.

— Чаму голенькая? — не пагаджаўся тата. — На ёй кара. Ёй цёпла.

— Можа апрануць яе на зіму? Ухутаць? — не сунімалася дзяўчынка. — На галінкі рукавічкі панадзяваць, а на ножкі — валёнкі?

— А дзе ж у бярозкі ножкі? — усміхнуўся тата. — Яе ножкі — карэнне.

— Зямля ж халодная.

— Гэта для нас з табой халодная, а для бярозкі цёплая. Вось выпадзе снег, укрые, як коўдрай, зямлю, і карэньчыкам стане яшчэ цяплей, а пакуль трэба паліваць бярозку, каб лепш расла.

Святланка палівала бярозку і чакала, калі выпадзе снег. Лісточкі даўно апалі. Бярозка выглядала як сірацінка побач з высокімі каштанамі і таполямі. Пра іх Святланка і не думала. Яны ж вялікія, моцныя. А бярозка тоненькая-тоненькая.

Прачнулася аднойчы Святланка, а на дварэ бела.

— Тата! — закрычала дзяўчынка. — Зіма прыйшла! Глянь, колькі снегу.

— Вось цяпер можна і валёнкі для бярозкі зрабіць, — сказаў тата.

Ён узяў шырокую рыдлёўку і пачаў падкідаць снег да бярозкі. І Святланка памагала сваім маленькім шуфлікам.

Неўзабаве бярозка і сапраўды стаяла як бы ў вялікіх снегавых валёнках. На яе чорных галінках таксама быў пушысты снег. Дакранешся — ён сыплецца, іскрыцца, зіхаціць.

Кожны раз, калі выпадаў снег, Святланка брала свой шуфлік і падграбала снег да дрэўца. Бярозчыны валёнкі станавіліся ўсё большыя і цяплейшыя.

А ўвесну, калі прыгрэла сонейка, бярозка ўбралася ў зялёнае лісце.

Іван Бурсаў

Як звяры зіму сустракаюць

Мядзведзь

На ўвесь бор,
На ўвесь бор
Гучна грукае тапор.
Гэта Мішка клышаногі
Чэша дошкі для падлогі.
Ставіць ложак, бо яму
Спаць і спаць усю зіму.
Ледзьве холад на парог,
Мішка шусь у свой бярлог.
Кладучыся, пазяхне,
Зарыпяць масніцы...
Хай яму ў мядзведжым сне
Толькі лета сніцца.

Заяц

Заяц шэры,
Заяц-зух
Да зімы пашыў кажух
Белы-белы. Зайца ў ім
Не пазнаць цяпер зусім.
Але зайцу не сядзіцца:
Мерзнуць вушы, лапкі.
Шые заяц рукавіцы,
Шые заяц шапку.
— А да ліскі не пайду,
Каб не трапіць у бяду...

Воўк

А ваўку-лайдаку
Працаваць няма ахвоты.
Ён блукае ў хмызняку
І зайцоў
Цікуе ўпотай.
А пра дом не дбае.
Дзе там!
Бо пацеў у футры летам.
Воўк забыўся, няйначай,
Што цяпло
Вось-вось міне...
Што ж, няхай зімой паскача,
Не шкада звяругі мне.

Лісіца

А лісіца-ліска
Не далёка — блізка
Адшукала норку,
Пачала прыборку
Вымятае пыл хвастом.
Цёплы дом...
Хай цяпер мароз трашчыць,
Снег па лесе
Сцеле...
— Трэба зайца запрасіць
Мне на наваселле!

Гацькі (2)

У нашым цыкле працягваем знаёмства з Гацькамі, што ў Бельскай гміне. Гэтай вёсцы і яе ваколіцы характэрныя не толькі цікавае мінулае і археалагічныя стаянкі. Наваколле крыніцы ракі Гай, якая з'яўляецца прытокам ракі Арлянкі, гэта ўнікальны геалагічна-батанічны комплекс. Дарэчы, каля вёскі Гацькі праплываюць прыгожыя ручайкі. Адзін з іх гэта ўзгаданы Гай, другі гэта яшчэ меншая рэчанька Смужка.

Навокал Гацькоў пражывае некалькі дзесяткаў відаў птушак, якіх цяжка сустрэць у іншых мясцовасцях Падляшша. Падобнае наглядаецца і ў свеце флоры. Паводле даследчыкаў, у наваколлі Гацькоў знаходзіцца найбольшая ў гэтым рэгіёне Польшчы колькасць — бо аж 400 відаў — цеплалюбівых раслін.

У мінулым нашы продкі называлі палі, лугі і ўрочышчы, якія акружалі іх мясцовасці. Назвы найчасцей адлюстроўвалі характэрныя рысы месца ці наваколля. Гарадзішча побач Гацькоў называецца Замок. Непадалёк яго знаходзіцца іншы узгорак — Бэтлаг. На жаль, сярод жыхароў вёскі цяжка знайсці кагось, хто мог бы растлумачыць значэнне гэтай назвы. Іншыя цікавыя назвы ўрочышчаў вакол Гацькоў гэта Ластаўчыны лужкі ды Бабскі луг. Значэнне гэтага астатняга тлумачыцца тым, што ў гэтай лагчыне ў мінулым збіралася вада і там жанчыны займаліся апрацоўкай ільну.

Але не толькі наваколле Гацькоў вартае ўвагі. Таксама ў самой вёсцы вельмі цікавая старая драўляная архітэктура. У ёй знаходзіцца пад дзесяць хат з прыгожай драўлянай разьбой. Цікавае, што не ўсе ўзоры аднолькавыя ці падобныя, як гэта бывае ў іншых вёсках Падляшша. Прычынай разнавіднасці арнаментаў з'яўляецца тое, што ў Гацьках працавала многа майстроў і кожны меў характэрныя сабе рысы разьбы.

На гэтым канчаем наш візіт у Гацькі. Варта наведаць гэтую цікавую мясцовасць, калі не з-за яе гісторыі дык каб паглядзець яе прыгожыя прыродныя адметнасці.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Ноч, ваўналак і жывая музыка

Тры гады таму назад у Полацку з'явілася новая ідэя. Відаць, не хапала мясцовым музычных падзей, бо паэтка Лера Сом і маладыя ўдзельнікі гурту „Індра" задумалі новы фестываль. Варта адзначыць, што слова „новы" тут не без значэння. Шмат гадоў арганізаваны быў там фэст „Рок-кола". З 2007 года пачаліся сапраўдныя праблемы, бо фестываль проста забаранілі, што здаецца зусім незразумелым.

Кася Камоцкая віншуе мінулагодніх лаўрэатаў

Не складае канкурэнцыі „Рок-колу" новаўтвораная „Ноч ваўкалака", бо так назвалі гэты фестываль. Прынамсі так казалі арганізатары. Галоўная ідэя новага полацкага фэсту — прэзентацыя толькі і выключна тых гуртоў, якія выступаюць на беларускай мове. Праўда, бывае і такое, як пры „Басовішчы" ці іншых фестывалях, што ў гурту толькі частка рэпертуару на спеўнай беларускай мове, але такім таксама даецца шанс. Неаднойчы ўжо бывала, што з гэтых 3-4 песень нараджаўся поўнасцю беларускі матэрыял і проста гурт станавіўся беларускамоўным. Так і наладзілі першую „Ноч ваўкалака". Мо каму здацца, што назва фэсту зусім немузычная. Магчыма, але супадае яна з асноўнай ідэяй фэсту. Паводле легендаў, душа вялікага полацкага князя Усяслава Чарадзея можа пераўтварацца ў сокала ці ў ваўка, таму і рашылі з мясцовай легендай звязаць гісторыю маладога фестывалю. Усё было б класна. Фестываль развіваўся б, гурты пераходзілі б на беларускую мову і ўсе жылі б доўга і шчасліва, каб не ўмяшаліся ўлады. Не, не, не забаранілі фестываль. Загадалі памяняць назву, якая ім надта асацыявалася з паганствам. Што ж, не было выхаду і такім чынам з гэтага году фэст называецца „LIVEinROCK". Не менш прыгожа, можа нават больш па-сучаснаму, але ўжо не так рамантычна. Затое прынцып беларускага слова застаўся. Такім чынам беларускі рок на Полаччыне пакуль што не загіне.

i_basovka@o2.pl

Галерэя Зоркі

1. Імя і прозвішча: Наталля Шацілоўская

2. Твой любімы прадмет: беларуская і польская мовы.

3. У жыцці хачу стаць: ветэрынарам, таму што я вельмі люблю жывёл і ў будучыні хачу ім дапамагаць.

4. У сяброў цаню: вернасць, дабрыню, шчырасць і сяброўства.

5. Не люблю: хлусні, самалюбства і вульгарнасці.

6. Па-беларуску размаўляю: з мамай і татам (на гаворцы) і на ўроках беларускай мовы.

7. Кніжка, якая мяне захапіла: „О, гэта Кася".

8. Падабаецца мне музыка: гуртоў „Зорка" і „Прымакі". Я слухаю польскую і беларускую музыку.

9. Люблю размаўляць з: сяброўкамі.

10. У „Зорцы" падабаецца мне: польска-беларуская крыжаванка.

11. Чаму: бо можна лепш пазнаёміцца з беларускай мовай і выйграць узнагароду.

Польска-беларуская крыжаванка № 47

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 43:

Нота, вой, спорт, ар, роля, крыніца, бас, ром, картка. Вочка, но, рыба, гонар, Ас, ліст, пляц, но, ара, рад, трыумф.

Узнагароды, „Святое пісанне" (для дзяцей), выйгралі **Наталля Тарасюк** з Дубін, **Юстына Вакулюк** з Арэшкава, **Эва Аярчук, Адрыян Антасюк, Віялета Дработка, Магдалена Міхалевіч** з Бельска-Падляшскага. Узнагароды падарыў сп. Міхал Аляксейчык, генеральны консул РБ у Беластоку.



Беларускія дыскатэкі ў Беластоку

У 45 нумары „Нівы” Ганна Кандрацюк піша, што БГКТ прычыняецца да паланізацыі беларусаў Беласточчыны. На маю думку, гэта няслушны закід. Дастаткова звярнуць увагу на тое, якой папулярнасцю сярод грамадскасці Падляшша карыстаюцца фэсты ды такія імпрэзы як Фестываль „Беларуская песня” або „Купалле” ў Белавежы. На апошнім мерапрыемстве стараюся пабываць штогод і бачу як шмат людзей з Беласточчыны прыязджае на гэтую імпрэзу.

Прыкладам папулярнасці хай будуць беларускія дыскатэкі ў Беластоку, якія арганізуюцца некалькі разоў у месяц. Білеты на дыскатэкі з'яўляюцца ў продажы на 5 дзён да імпрэзы і ўжо на другі дзень яны распрададзены. Значыць, карыстаюцца яны папулярнасцю, бо маладыя людзі ахвотна ходзяць на такія імпрэзы, а як ходзяць, то значыць, што любяць і шануюць беларускую культуру. Факт, на дыскатэках гучыць і расейская, і ўкраінская музыка, але ў асноўным да танцаў падыгрываюць гурты, якія прызнаюцца да беларускасці, напрыклад, лідар гурту „Ас” Славамір Трафімюк ці лідар „Прымакоў” Юрка Астапчук. Яны ж у народзе асацыююцца з беларускай культурай і самі пра гэта даказваюць, размаўляючы на прыгожай беларускай мове. І такіх гуртоў у нас больш за 30 і колькасць іх пабольшваецца. Не трэба абвінавачваць маладое пакаленне беларусаў-беластачан у няведанні беларускай мовы, бо ж яны не вінаватыя, што не мелі магчымасці вывучаць родную мову. Самае важнае, што яны адчуваюць супольнасць з беларускай культурай і таму наведваюць беларускія дыскатэкі.

Хачу сказаць таксама, што, напрыклад, на імпрэзы БАСу прыходзіць шмат палякаў, якія не маюць нічога супольнага з беларускасцю, а проста адчуваюць там сябе моўнымі і культурнымі дылетантамі. Прыкладам можа быць мая сяброўка, полька-каталічка, якая зусім не ведае беларускай мовы і не цікавіцца беларускімі справамі, а была на сёлетнім „Басовішчы”. Тая ж сяброўка сказала мне прыкрыя словы, калі я ў яе прысутнасці размаўляў па-беларуску з сябрам з Беларусі: „Przestańcie gadać po murzyńsku, bo ja was nie rozumiem”. А на „Басовішча” паехала. І шмат такіх „турыстаў-авантурыстаў”, як спяваў Лявон Вольскі, ездзіць на імпрэзы БАСу. А на беларускія імпрэзы ходзяць мае шчырыя сябры, з якімі размаўляем па-беларуску або на падляшскім дыялекце і не абзываем сябе неграмі. На беларускіх дыскатэках адчуваем сябе беларусамі.

Юрка БУЙНЮК

Размовы аб...

Людвіку Заменгофе
(150 гадавіна з дня нараджэння)
і мове эсперанта

з Яраславам Пажышкам
— старшынёю Фонду Людвіка Заменгофа
24 лістапада 2009 г. (аўторак), а гадз. 17.30

Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка”

Мастацкае слова ў Гайнаўцы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Мастацкія сустрэчы школьнікаў ладзяцца па ініцыятыве настаўніка беларускай мовы Яна Карчэўскага. Яму, галоўнаму арганізатару мерапрыемства, дапамагаюць Беларускі музей у Гайнаўцы і Гайнаўскі белліцэй, у якім ён працуе. У гэтым годзе дзеткі і моладзь з Гайнаўкі, якія вучацца беларускай мове, спаткаліся ў музейных памяшканнях 8 лістапада, каб выступіць перад бацькамі, сямейнікамі і сябрамі з беларускім рэпертуарам. Ужо традыцыяй стала, што перад шырэйшай гарадской публікай вучні паказваюць на беларускай мове тэатральныя пастаноўкі, спяваюць песні, расказваюць пра цікавыя здарэнні і дэкламуюць вершы. Маладыя акцёры рыхтуюць адмысловы матэрыял пад музейнае мерапрыемства або паказваюць тыя сцэнкі і музычныя творы, з якімі ўжо паспяхова выступалі на працягу папярэдняга навучальнага года. Каб заахвоціць вучняў і педагогаў да выступаў з новай праграмай, Ян Карчэўскі перанёс мерапрыемства з кастрычніцкай нядзелі на лістападаўскую і такім чынам амаль на месяц прадоўжыў час падрыхтоўкі да выступленняў. У гэтым годзе з праектам VI Мастацкіх сустрэч школьнікаў выступіў ён за фінансавую падтрымку ў Гайнаўскае староства. Дзякуючы атрыманай дапамозе мог зрабіць сустрэчу больш прывабнай для акцёраў.

Перад мерапрыемствам музейная кіназала хутка запоўнілася публікай. Пасля ўступнага слова арганізатара і вядучага сустрэчу Яна Карчэўскага, першымі выйшлі перад публіку вучні Падставовай школы № 5 Аляксандра Якімюк і Матэвуш Гаўрылюк, якія ўдала дэкламавалі вершы.

Беларускія выступленні гэта не толькі падвядзенне вынікаў пазаўрочнай працы, калі дзеткі і моладзь маюць магчымасць выявіць сваю актыўнасць у занятках, якія асабліва іх цікаяць, але таксама прапагандаванне навучання беларускай мове ў гайнаўскім асяроддзі. Асабліва малодшыя дзеткі выступы на сцэне ўспрымаюць як вылучэнне і ўзнагароду. Бывае, што расказваюць аб гульні ў тэатр, выступах з беларускімі песнямі і вершамі сваім сябрам і заахвочваюць іх да вучобы па-беларуску.

— Каб заахвоціць дзетак наведваць заняткі беларускай мовы, мы на ўроках і ў школе ладзім конкурсы, знаёмім з народнымі абрадамі і прыводзім нашых вучняў у Беларускі музей. Нашы дзеткі выступаюць таксама ў музейным калектыве „Сявенька”, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Комплексу школ № 3 у Гайнаўцы Беата Кендысь і дадае, што вучні вельмі ахвотна выступаюць у час мастацкіх сустрэч. Пра экскурсіі ладжаныя ддя вучняў, што ходзяць на заняткі беларускай мовы, таксама расказвае настаўніца гэтай школы Людміла Грыгарук. Гаварыла яна пра дзіцячы фальклор, з якім знаёмяцца малодшыя вучні, пра беларускія песні і танцы, якім ахвотна вучацца дзеткі з Падставовай школы № 6.

— Ідэя мастацкіх сустрэч — гэта пастаянная прэзентацыя здольнасцей і ўмеласцей вучняў перад бацькамі і шырэйшай публікай. Добра, што маем магчымасць прапагандаваць беларускую культуру як сярод вучняў, так і дарослых, — лічыць настаўнік і заадно намеснік старшыні ўправы Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы” Ян Карчэўскі. Арганізуючы мастацкія сустрэчы, заахвочвае ён вучняў і бацькоў наведваць Беларускі музей.

З пастаноўкай „Вяселле” ўдала выступілі гайнаўскія белліцэісты

З ліку гайнаўскіх школ, канешне, найбольш вучняў ходзіць на заняткі па беларускай мове ў белліцэі і белгімназіі. Тэатральны гурток „Драма” з белліцэя (апякун Ян Карчэўскі) цікава выступіў з пастаноўкай „Вяселле” і заняў першае месца ў катэгорыі малых сцэнічных форм у конкурсе „Сцэнічнае слова”. Калектыў з белліцэя (Павел Верамюк, Лукаш Сідарук і Мацей Кучка) выступіў з беларускай музычнай праграмай, якому горача апладзіравала публіка.

Па колькасці навучэнцаў беларускай мовы па другім месцы стаіць Комплекс школ № 3, распаложаны па вуліцы Новаваршаўскай. На беларускія заняткі ходзіць там пад 200 асоб. У адзін з першых класаў, дзе вядзецца навучанне роднай мове, запісваюць бацькі па 15-20 дзетак, а ў гімназіі колькасць аднагодкаў, якія вучацца па-беларуску, павялічваецца і пад 30 асоб. Лік вучняў ахвотных вучыцца сваёй мове часта большае з-за кандыдатаў, што хочуць паступаць у Гайнаўскі белліцэй. Аднак частка вучняў, што ходзяць на ўрокі беларускай мовы ў падставовай школе, выбірае пасля прафесійныя школы. Вучыліся яны беларускай мове, бо гэты прадмет быў ім даспадобы, а часта і настаўніца ўмела заахвоціць дзетак вучыцца па-беларуску. Якраз найбольш дзетак прыбыло на мерапрыемства з Падставовай школы № 6, якая ўваходзіць у састаў Комплексу школ № 3. Вучаніцы з другіх і трэціх класаў адважна танцавалі і спявалі песню „Дзве курачкі”, а Аляксандра Ціханюк сола праспявала песню „Купалінка”. Вучні з IV „а” класа ўмела выступілі з інсцэніроўкай „Восень”, паказваючы адметнасці восеньскай пары, дэкламавалі і расказвалі. Якраз Анна Несцярук з казкай „Людзей слухай, а свой розум май” заняла ў мінулым годзе першае месца ў конкурсе беларускай гавэнды, а Марыянна Цівун з вершам „Спрэчка звяроў” здабыла першае месца ў час раённага тура конкурсу „Роднае слова”.

— Нашы вучні вельмі ахвотныя да спеваў і танцаў. Хочуць вучыцца новаму і выступаць перад публікай. У час мастацкіх сустрэч дзеткі і бацькі рады, што маюць магчымасць выйсці з дому і супольна правесці час, — расказвае настаўніца беларускай мовы Людміла Грыгарук.

Каб развесяліць публіку, калектыў „Крынічка” з ПШ № 6 падрыхтаваў танец да песні „Ехалі казакі”.

— Калектыў „Крынічка”, якім я апякуюся, дзейнічае звыш года. Мае вучаніцы ўдала танцавалі ў час „Беларускага свята”, ладжанага ў нашай школе, — кажа настаўніца Беата Кендысь.

Асаблівае хваляванне наглядалася сярод наймалодшых дзетак. Часта былі гэта іх першыя выступленні перад так вялікай публікай. А ўсмешкі старэйшых вучняў маскіравалі іх унутраную засяроджанасць, бо не мелі б сэнсу выступы абы толькі „адбарабаніць” навучанае.

— Перад прэзентацыяй нашай пастаноўкі мы хваляваліся, каб не забыць сваіх тэкстаў, — сказала адна з белліцэістак.

Пасля акцёрскай ігры перад публікай дзеткі і моладзь з палёгкай пераходзілі ў музейнае памяшканне, дзе адбываўся пачастунак. Тут панаваў вясёлы гоман, у час якога праяўлялася радасць ад супольнай гульні.

Хаця мала дзетак вучыцца ў Падставовай школе № 3 у Гайнаўцы (у квартале Юдзянка), то там амаль усе маладыя людзі вучацца па-беларуску. Іх настаўніца беларускай мовы Марыя Крук заахвочвала ў мінулых гадах рыхтаваць большыя пастаноўкі па-беларуску і выступы дзетак з гэтай школы ў час мастацкіх сустрэч заўсёды былі даўжэйшымі і займальнымі. У гэтым годзе група вучняў з ПШ № 3 некалькі разоў выходзіла на сцэну. Паказалі яны дзве цікавыя пастаноўкі да музычных твораў „Чырвоная каліна” і „Васількі”, спявалі песні.

У гэтым годзе перад гайнаўскай публікай выступіў таксама гурт з-па-за школы — вакальны калектыў Гмінага асяродка культуры ў Белавежы, які нядаўна пачаў дзейнічаць пад кірункам Марка Зубрыцкага. У калектыве ўдала выступілі вучні розных сярэдніх школ, у тым ліку і белліцэя. Дзеткі і моладзь, што выступалі ў тэатральных сцэнках, мусілі шчыра напрацавацца, бо трэба ім было часта сустракацца на рэпетыцыях. Некаторыя вучні праявілі свае тэатральныя здольнасці, якія могуць развіваць, прымаючы ўдзел у беларускіх конкурсах.

— Мы доўга рыхтаваліся да пастаноўкі „Вяселля”, — кажа белліцэістка Эвеліна Раманчук, выконваючая ў інсцэніроўцы ролю маці. — Мяне цікавіць гульня ў тэатр і я нават хацела б стаць акцёрам.

Анатоль Сыс, паэт Беларусі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У халодны дзень канца кастрычніка ідзем у Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, да Анатоля Сыса. Вёска на беразе Дняпра, у адным з самых старажытных пасяленняў чалавека ў Беларусі. „Мая хата пасярэдзіне вёскі (доўгай у 5 км, нумар дома 127) — М. Л.), яна на старажытным гарадзішчы", — адзначыў быў з гонарам Анатоль, падарыўшы майму сыну ў 1994 г. гліняны скарб з раскопак. Гарошкаў бачым здалёк, над Дняпром, выходзячы з-пад моста з путаніны шырачэзных магістралей. Белую хату ведаюць усе: там жыў Толік, які так ганарыўся Гарошкавам, сваім раем. Анатоль, Ціханаў сын, званы па вулічнаму Цішкам. А за мостам, направа — бярозавы гай. Могілкі, дзе стаіць Толікаў помнік сярод магілак найбліжэйшых, — бацькоў Ціхана і Марыі, мужа сястры Тамары і яе памерлых маладымі прыгожых і таленавітых дзяцей. Далей — магілкі дзядоў і прадзедаў, і іншых гарошкаўцаў. А на яго магілу прыходзяць цяпер жывыя — старыя і маладыя, і сядзяць, бывае, да ночы. Або і далей. І спяваюць. Найлепш Толік любіў „Дробную драбніцу" і так гожа спяваў...

Анатолю Сысу 26 кастрычніка 2009 года было б 50 гадоў. „Праклятаму паэту". Цяпер яго велічаюць, ушаноўваюць, а быў час, калі аж яго жахаліся, баяліся. Раптам паявіліся кагорты сяброў, каханых, даследчыкаў, што аж захлісталіся ад апісання кранання таямніцы і геніяльнасці, вылучаючы найперш... сябе. Сапраўдныя сябры яго не пакінулі. Тыя, хто пачынаў з ім вучобу ў Гомельскім універсітэце, творцы з „Тутэйшых". „Анатоль Сыс па сённяшні дзень з'яўляецца для мяне таямніцай. Дзе ў ім шчырасць? Дзе гульня? Дзе блюзнерства? Ці ведае ён сам? — раздумваў у 2001 годзе, чатыры гады да смерці Анатоля, Алесь Аркуш. — Усё было ўчора. Усё было на нашых вачах. А мы разважаем і мяркуем пра той час як пра нейкую смугу-мінуўшчыну — няўцямнымі дэфініцыямі заўчасна састарэлых крытыкаў і пустамельствам кандыдацкіх манаграфій. А часцей увогуле не звяртаем на набыткі і страты 90-х якой-кольвечы ўвагі. Можа, сапраўды, вялікае бачыцца на адлегласці? (...) Ніхто з беларускіх паэтаў напрыканцы 80-х не меў такой славы, як трыццацігадовы Толя Сыс. Я і сёння выразна згадваю тое пачуццё, якое выклікаў у мяне Анатоль чытаннем верша «Маналог „Тутэйшага"» на мітынгу ў Верхнім горадзе. Як бегалі мурашкі па спіне, перасыхала ў горле, здавалася, усім целам адчуваеш энергетыку пранікнёнага вершаванага слова. (...) І прыйшоў той дзень. І высветлілася, што за славу не купіш нават бохана хлеба; што слава — уяўная капрызлівая, распусная дзеўка; што сёння паэзія — хутчэй справа святарская, чым карчмарская. (Нездарма Алег Бембель, якога Сыс назваў сваім настаўнікам, у свой судны дзень сышоў у Жыровіцкі манастыр). Паэзіі, як і Богу, трэба слугаваць, змірыўшы сваю плоць і пажаду. (...) Сысу не было на што абаперціся... Анатоль Сыс мог толькі пісаць вершы. Геніяльныя вершы. Але нікому яны ўжо не былі патрэбныя. Абсалютна нікому! (...) Прыйдзе час, і Дух паэзіі Анатоля Сыса светлым птахам вернецца ў Беларусь: «На смерць не трэба апранах — яны сіло для крыл маіх». А можа, той Дух і не адлятаў? Доўгіх гадоў табе, Анатоль. Дзякуй за вершы і вучобу!"

Сілюмінієвую табліцу праектаваў Павел Лук

Анатоль Сыс быў як памечаны ад самага нараджэння. Калі маці, настаўніца пачатковых класаў у вёсцы Бронная, была ім цяжарная, выбух пажар у суседняй хаце. Маці абгарэла, ды ўратавала дзіцятка. У тую ноч нарадзіўся Анатоль. Пару месяцаў абое былі ў бальніцы. Маці Марыя не прытуліла нованароджанага, уся ў ранах. Ён быў найменшы з чатырох дзяцей у сям'і... У траўні 2005 г. суседка паэта Ала звярнула ўвагу, што ў Анатолевай кватэры трое сутак гарыць святло. Пазваніла сястры Валі ў Брэст. З міліцыяй выбілі дзверы. Паэт быў ужо некалькі дзён нежывы. Захлынуўся крывёю. Я была адной з апошніх асоб, якія бачылі яго жывога. Сядзелі мы адны ў канцы красавіка 2005 года тры дні і ночы. Гаварылі пра жыццё, якое будзе. Былі вершы. Хоць былі такія, хто перастаў у Анатоля верыць. Былі яшчэ толькі тры кнігі: „Агмень" (1988), „Пан лес" (1989) і „Сыс" (2002). „Лён" выйшаў у 2007 годзе.

Асоба і месца Сыса ў паэзіі выклікае спрэчкі. Некаторыя ставяць яго ўпоравень з Купалам і Багдановічам. „Ён быў панк і нават бажаволак" — мяркуюць іншыя. Чым далей, становіцца ён легендай. Штораз выразнейшыя ўспаміны: „На заняткі ў «Гомельскі дзяржаўны ўнівермаг» ён і ягоныя сябры хадзілі ў куфайках і гумовых ботах. Падчас лекцыяў дэманстратыўна елі сала з цыбуляй. Станавіліся кардонам перад уваходам на дыскатэку і пускалі толькі тых, хто цалаваў чырвона зялёны БССРаўскі сцяг... Чысты панк познесавецкай эпохі, з дапамогай якога імкнуліся намацаць, зразумець — што ж яно такое, твая Беларусь" (Сяргей Мікулевіч). І святкуюцца ягоныя пасмяротныя „дні": 16 кастрычніка ў Мінску, у музеі Максіма Багдановіча, была адкрыта выстава „Мая хата без сяброў не хата", прысвечаная юбілею паэта з жывапіснымі творамі Алеся Квяткоўскага. 21 кастрычніка ў Гомелі, у Карціннай галерэі імя Гаўрылы Вашчанкі — адкрыццё выставы Алеся Квяткоўскага „На крыле ў пчалінай маткі...": „Няхай шаноўны глядач пачытае вершы, падумае над карцінамі і, пайшоўшы з выстаўкі, зразумее, што побач з ім, у якіх 50 км, у вёсцы Гарошкаў, Рэчыцкага раёна, зараз вядомай на ўвесь свет, жыў і пахаваны цудоўнейшы Паэт Беларусі Анатоль Ціханавіч Сыс..." (Алесь Квяткоўскі). 26 кастрычніка ў Мінску, у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры — літаратурная вечарына, У Гомелі — літаратурная вечарына, у праграме: паказ відэафільма, выступы бардаў і паэтаў. У Гомелі ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Герцэна адкрыты тэматычны стэнд, прысвечаны паэту Анатолю Сысу. У Рэчыцы, у Цэнтральнай раённай бібліятэцы — літаратурна-музычны вечар-партрэт, 31 кастрычніка ў Гарошкаве — свята паэзіі ў гонар Анатоля Сыса «Дух — гэта, людзі, Я!..» Ускладанне кветак на магілу паэта, урачыстае адкрыццё мемарыяльнай шыльды на доме паэта, прэзентацыя кнігі паэтычных прысвячэнняў Анатолю Сысу „Ягамосць" і кнігі выбраных вершаў паэта „Алаіза", паэтычныя чытанні і бардаўскі канцэрт на падворку роднай хаты Анатоля Сыса.

У свяце прынялі ўдзел родныя і землякі Анатоля, яго-

працяг ☞10

ПЕСНЯ ПРА ЖАНУ

Ахвярую Юрыю Кузняцову

У расейцаў шаблі касыя,
у расейцаў вочы Батыя,
конскія хвасты за плячыма,
потная кабыла — Айчына.

Не патрап пад шаблі касыя,
не павер у вочы Батыя,
не сядлай жарэбнай кабылы —
прывядзе да цёмнай магілы.

А ў мяне ж свая ёсць магіла,
а мяне ж яна палюбіла,
палюбіла сынам і мужам,
як жану, я біў яе гужам,
а я біў-пытаўся: ці мала
да мяне з чужынцамі спала?

„Спала з маскалём, спала з ляхам,
ды была пасцеллю мне плаха,
спала з тваім бацькам — ліцвінам,
а цяпер з табой — маім сынам,

паглядзіся ў рэчкі лясныя,
хіба ж маеш вочы Батыя,
хіба ж конскі хвост за плячыма,
паглядзі — з кім спала Айчына,

а ў расейцаў шаблі касыя,
а ў расейцаў вочы Батыя,
конскія хвасты за плячыма,
потная кабыла — Айчына.

Не патрап пад шаблі касыя,
не павер у вочы Батыя,
не сядлай жарэбнай кабылы —
прывядзе да цёмнай магілы,

а ў цябе ж свая ёсць магіла,
а цябе ж яна палюбіла,
палюбіла сынам і мужам,
як жану, ты біў яе гужам,
а ты біў-пытаўся: ці мала
да цябе з чужынцамі спала.

Спала з маскалём, спала з ляхам,
ды была пасцеллю мне плаха,
спала з тваім бацькам — ліцвінам,
а цяпер з табой — з маім сынам,

паглядзі у рэчкі лясныя, —
хіба ж маеш вочы Батыя,
хіба ж конскі хвост за плячыма,
паглядзі — з кім спала Айчына".

ПАЭТ

Ніхто не мае права жыць з Паэтам,
кахаць, пакутаваць і раўнаваць яго,
не тыя дні, калі б ён дбаў пра гэта,
не той напой, які б ён піў нагбом.

Ніхто не мае права мець Паэта,
рабіць яго паяцам пры двары,
таму што гэта... ды таму,
што гэта —
народа і паэзіі падрыў.

Ніхто не мае права біць Паэта,
ён нават сам не вольны над сабой,
магчыма, ён адзіны на паўсвета,
а вы за ім нібыта за гарой.

Паэт не мае права быць паэтам
цнатлівае і чыстае красы,
калі ў айчыне загніваюць рэкі
і засыхаюць на вачох лясы.

***

Дарога полем — да маці.
Дарога лугам — да бацькі.
Дарога рэчкай — да любай.
Але
і полем, і лугам, і рэчкай
іду заўжды да Радзімы.

9 ☞ працяг

Кася Камоцкая спявае песні на словы Анатоля Сыса

ныя сябры, а таксама вядомыя беларускія паэты, барды і мастакі. У тым ліку: Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Эдуард Акулін, Барыс Пятровіч, Алесь Камоцкі, Кася Камоцкая, Алесь Бяляцкі, Сяржук Сыс, Міхась Скобла, Ларыса Раманава, Вальжына Цярэшчанка, Павел Змітрук, Кастусь Герашчанка, Павел Лук, Генадзь Лапацін і мы, сябры Анатоля з Беласточчыны. За ўсімі мерапрыемствамі ходзяць людзі ў форме і без формы, спісваюць удзельнікаў. Ужо не зрываюць свят, як за апошнія чатыры гады.

Міхась Скобла: „1987 год... Менск, каля помніка Янку Купалу, мітынг на Дзяды. І ён упершыню на гэтым мітынгу перад вялікай грамадой пералічыў усіх беларускіх паэтаў, якія загінулі ад камуністычнага тэрору. Гэта быў доўгі спіс, публічна агучаны Анатолем — першы публічны мартыралог, калі былі прыгаданы нявінна загубленыя беларускія творцы".

Эдуард Акулін: „Лёс сапраўдных творцаў — свядомае самаўкрыжаванне на літаратурнай Галгофе. На сваю паэтычную Галгофу Анатоль Сыс узышоў у 45 гадоў, узваліўшы сабе на плечы грахі гэтак званых нацыянальных „праведнікаў", цярпліва зносячы фарысейскія кпіны сяброў, мужна трываючы агасферскія ўдары ў спіну гандляроў ад літаратуры. (...) Дык хто ён, паэт Сыс — псеўдапрарок, літаратурны адступнік ці напраўду беларускі Месія?.. (...) Кожны хай вырашыць для сябе сам, уваходзячы, як у святы Іардан, у жыватворную плынь ягонай Паэзіі, каб прычасціцца Агменем ягонай несмяротнай душы і даравацъ яму нарэшце ўсё і ўся... у імя нашай роднай бацькаўшчыны, у імя залатой Беларусі. Бо толькі ён адзін здолеў сказаць пра яе так, як да яго не здолеў сказаць ніхто і ніколі: *Беларусь мая, мая магіла, з бел-чырвона-белага радна, ці кашулю мне на смерць пашыла? Беларусь мая, мая магіла, ты ж адна ў мяне, як ёсць адна...*

Фота Паўла ЛУКА

Міра Лукша (злева) і Ганна Кандрацюк на магіле паэта

СЭРЦА

(З нізкі „ПЕСНІ ПРА СЫНА")

Мне на сэрцы золатам вышывалі краты[1],
кроў балюча крапала на маю душу
з голкі дыяментавай аж у тры караты —
вось якое дзіва я ў грудзях нашу.

А бывае, падаю з усяго размаху,
дык на сэрцы золатам шэсць крыжоў звіняць
аб зямельку родную, быццам меч аб плаху, —
ні віном, ні лекамі боль той не суняць.

Дзе ўпаду, каб ведаў я, дык падклаў падушку б,
але ж вочы-зоркі сочаць, на бяду,
мабыць, цяжар кратаў датуль насіць мушу,
пакуль ў магілу-матку не ўпаду.

Мне на сэрцы золатам лёс мой вышывалі,
нітак не хапіла на апошні прэнт,
а калі паўмёртвага мяне пакідалі,
уваткнулі ў сэрца голку-дыямент.

Можа, каму трэба залатая нітка,
голка з дыяменту, я вас папрашу,
калі вам няцяжка, калі вам нябрыдка, —
выратуйце сэрца, вызвальце душу!

Гэта ж вельмі проста: нітку — у клубочак,
голку — у скарбонку, што ў крыві — дарма,
без віны ды боязі спіце сабе ўночы,
ну а вашым ворагам сніцца хай турма.

З матамі, вар'ятамі,
з сабакамі іклатымі,
ды пад аўтаматамі
з залатымі кратамі
будзе
хай
яна!

[1] *Радок з верша „Купала" Алеся Філіповіча.*

Беларусь,беларусы...

Вельмі прыемна, што апошнім часам у інтэрнэце з'яўляецца ўсё больш і больш сайтаў, што належаць беларускім літаратарам. З некаторымі асабістымі літаратурнымі парталамі „Ніва" ўжо знаёміла сваіх чытачоў. Сёння хочацца звярнуць увагу на сайт пісьменніка Леаніда Дайнекі, што месціцца па адрасе **www.daineka.by.**

Даны сайт ад іншых адрозніваецца выдатны дызайн. Хоць і зроблена галоўная старонка даволі традыцыйна, звыклае дзяленне на дзве часткі не кідаецца ў вочы. Невялікі аўтабіяграфічны вершык і выява „куфэрка думак" пісьменніка адразу інтрыгуе і штурхае да далейшага віртуальнага знаёмства з Леанідам Дайнекам. Зрабіць гэта лепей, шпацыруючы па старонках сайта.

Рубрыка „Навіны" распавядае пра падзеі ў творчым жыцці пісьменніка. Яны, у асноўным, канстатуюць, над якім творам Леанід Дайнека пачаў працу, а над якім скончыў.

Даведацца больш падрабязна пра біяграфію пісьменніка дазваляе рубрыка „Біяграфія". Там распавядаецца аб тым, што Леанід Дайнека родам з-пад мястэчка Клічаў, што на Магілёўшчыне. Яму ўжо без малога 70 гадоў, а друкавацца ён пачаў з 1961 года.

Пералік напісаных Дайнекам твораў месціцца на старонцы „Бібліяграфія". „Творы друкаваліся на рускай, украінскай, польскай, англійскай, эстонскай, латышскай, літоўскай, малдаўскай, армянскай, грузінскай, ідыш, іўрыце і іншых мовах", — з гонарам распавядае аўтар на гэтай старонцы.

Рубрыка „Творы" гэта свайго роду сэнсавы працяг „Бібліяграфіі". Там не толькі пералічаны творы, напісаныя Дайнекам, але і даецца іх электронная версія. Падрубрык на данай старонцы даволі многа, гэта — „Проза", „Паэзія", „Герадоцінкі", „Песні", „Публіцыстыка", „Для дзяцей", „Аўдыё". Ёсць тут і падрубрыка „Сцяпан Дайнека", але яе можна было б назваць як заўгодна, бо там ніякім чынам не распавядаецца пра гэтага чалавека. Даведацца, што ён — сын пісьменніка можна толькі зазірнуўшы на старонку „Фотагалерэя", дзе размешчаны фотаздымкі, звязаныя з асабістым і творчым жыццём Леаніда Дайнекі.

Пэўна кожны наведвальнік сайта знойдзе нейкі твор, напісаны Дайнекам, больш цікавым і трапным. Сярод такіх — верш „Калі б вы былі жывыя...", дзе паэт распавядае пра сваіх дзядоў, але найбольш пра таго, які „Зямлю — мерзлавуху парыць/ На Калыме". У сярэдзіне мінулага стагоддзя цягам некалькіх дзесяцігоддзяў сотні тысяч простых сялян, паверыўшы бальшавікам, потым ставілі такое пытанне і спрабавалі знайсці на яго адказ: „— Я ж быў кожнай кропляй савецкі,/ Камуне вярнейшы друг./ Завошта ж мяне знявечылі,/ Забралі і серп, і плуг?".

Не цураецца Леанід Дайнека і палітыкі. Пэўна з гэтай акалічнасці віншуе ён усіх з чарговымі ўгодкамі абвяшчэння незалежнасці БНР, а таксама прапануе ўласную версію гімна Рэспублікі Беларусь, паклаўшы ўласныя словы на музыку дзеючага гімна, напісаную Нестарам Сакалоўскім.

Старонка „Узнагароды" змяшчае выявы медалёў і дыпломаў, што атрымаў за сваю творчую дзейнасць пісьменнік. Сярод гэтай галерэі ўзнагарод найбольш цікавымі падаюцца дыпломы за раманы „Меч князя Вячкі" і „След ваўкалака". Абодва раманы — гістарычныя і распавядаюць, адпаведна, пра барацьбу з крыжакамі і пра полацкага князя Усяслава Чарадзея.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

У чаканні выбару

Хакейная зборная Беларусі пасля раптоўнага звальнення з капітанскага мосціка канадыйца Глена Хэнлана засталася стаяць на скрыжаванні выбару новага настаўніка. Часова гэты пост быў даручаны Андрэю Гусаву. Той не сапсаваў абедні, выйграўшы з эксперыментальным складам нацыянальнай дружыны традыцыйны Кубак Палесся. Каманда, за якую выступала пераважна моладзь і ў якой было ажно чатырох абсалютных дэбютантаў, паслядоўна з аднолькавым лікам 4:2 адолела Аўстрыю, потым Данію, а ў вырашальным паядынку Нарвегію — 3:2. Шайбы на свой рахунак запісалі Яраслаў Чупрыс (дзве), Аляксандр Жыдкіх, Аляксандр Кулакоў, Андрэй Антонаў, Віктар Андрушчанка, Андрэй Стась, Іван Усенка, Павал Развадоўскі, Вадзім Сушко і Дзмітрый Корабаў. Такім чынам бліжэйшы рэзерв не падвёў. Што далей? Зразумела, што на алімпіяду каманду павязе не Гусаў. Ён зусім нядаўна быў пераведзены з пасады галоўнага ў салігорскім „Шахцёры" на ролю асістэнта Аляксандра Андрыеўскага — новага генеральнага коўча мінскага „Дынама". Малаімаверна, што зборную даручаць гэтаму новаспечанаму тандэму „бела-блакітных". Зрэшты, патэнцыйна ўдалы выступ бліжэйшым часам „Дынама", якое дэкларавае базавым клубам галоўнай дружыны ў рэгулярным першынстве Кантынентальнай хакейнай лігі, можа падштурхнуць кіраўніцтва федэрацыі да такога кроку. Пакуль „зубры" з пераменным поспехам балансуюць у зоне плэй-оф, размяшчаючыся на восьмым-дзевятым месцы Заходняй канферэнцыі. Андрыеўскі, трэба яму аддаць належнае, стаў крыху больш рабіць стаўку на беларусаў, чым яго папярэднік — Хэнлан.

Міхаіл Захараў, галоўнакамандуючы сталічнага „Юнацтва", якое ўпэўнена трымае лідарства ў беларускай экстралізе, быў бы прэтэндэнтам нумар адзін на вакантнае месца, але ён зусім нядаўна звязаў сябе кантрактным абавязкам з украінскай нацыянальнай зборнай. Пошук галоўнага трэнера за акіянам ці ў Еўропе зараз малаверагодны — заходні вектар крыху сябе дыскрэдытаваў. Таму, напэўна, ведамства Уладзіміра Навумава ўрэшце схіліцца да аднаго з двух расійскіх варыянтаў замяшчэння Хэнлана. На паверхні „ляжыць" найперш кандыдатура Уладзіміра Крыкунова, чалавека не чужога беларускаму хакею. Яшчэ гульцом ён выступаў за мінскае „Дынама". І менавіта гэты галоўны рулявы дасягнуў са зборнай Беларусі найвышэйшага месца на белай алімпіядзе — у Солт-Лэйк-Сіці-2002 беларусы адолелі Швецыю і сенсацыйна занялі 4-е месца. Але да Крыкунова пакуль ніхто з канкрэтнай прапановай не звяртаўся. Па-другое, ён задзейнічаны на працы ў ніжнекамскім „Нафтахіміку" і шмат за яго будзе вырашаць кіраўніцтва гэтай каманды. Больш рэалістычным варыянтам з'яўляецца запрашэнне Уладзіміра Юрзінава-малодшага, які зараз знаходзіцца ў „творчым прастоі". Тым больш, што яго бацька — знакаміты ветэран трэнерскага цэху зараз запрошаны кансультантам якраз у мінскае „Дынама".

У кожным разе сітуацыя за тры месяцы да алімпійскага Ванкувера застаецца няпэўнай, а значыць і трывожнай. Многія напрацоўкі апошніх пяці гадоў пайшлі пылам, а што ўдасца зрабіць новаму галоўнаму трэнеру падаецца суцэльнай загадкай. Многае будзе залежаць і ад таго, ці ўдасца „містэру Х" вывесці лідараў дружыны на пік формы, з'яднаць калектыў. Уся хакейная грамадскасць зараз чакае выбару федэрацыі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Чаромхаўская асвета і адукацыя (2)

Падставовая школа

У Падставовай школе ў навучальным 2008/2009 годзе вучылася 173 вучняў у васьмі аддзелах, у тым ліку ў класах I-III — 84 вучняў і IV-VI — 89. Рабочы калектыў школы састаўлялі 34 асобы — 19 настаўнікаў (12 дыпламаваных, 3 назначаных, 4 кантрактных) і 15 адміністрацыйна-гаспадарчых працаўнікоў (10 у рабочай брыгадзе, 2 у адміністрацыі і 3 у бухгалтэрыі). У ходзе навучальнага года наступіла рэарганізацыя ў адміністрацыі. Увольнілі з працы сакратарку і галоўнага бухгалтара. На іх месца прынялі сакратарку, галоўнага бухгалтара (часова) на 2/3 стаўкі і памочніка бухгалтара на паўштату. Мадэрнізаваліся дыдактычна-выхаваўчыя залы, быў праведзены рамонт школы. З фінансавых сродкаў праекта „Comenius” 14 тысяч зл. выдаткавана на закупку двух інтэрактыўных дошак і 10 тысяч зл. на спартыўныя прылады.

Вучні падставовай школы актыўна ўдзельнічалі ў шматлікіх конкурсах і турнірах:

— Агульнапольскі турнір ведаў аб бяспечнасці ў дарожным руху — першае месца ў павеце;

— Турнір „Наша бяспечнасць” — другое месца ў павеце;

— Гайнаўскія сустрэчы з калядкай — група вучняў, якія вывучаюць украінскую мову, заваявала другое месца;

— Конкурс чытання „Bajе, bajki i bajeczki” — другое месца ў раёне;

— Агульнапольскі турнір чытання старажытнацаркоўнаславянскіх тэкстаў — узнагарода;

— Конкурс рэлігійнай паэзіі — трэцяе месца ў павеце.

Школьнікі ўдзельнічалі яшчэ ў раённым конкурсе польскай мовы, а таксама ў міфалагічным, матэматычным і арфаграфічным конкурсах. Вучні прадстаўлялі школу на спартыўных спаборніцтвах. У настольным тэнісе каманды дзяўчат і хлопцаў заваявалі залатыя медалі на павятовых спаборніцтвах. У канчатковай класіфікацыі 127 малых падставовых школ Падляшскага ваяводства ПШ у Чаромсе заняла 34 месца.

У навучальным 2008/2009 годзе 24 вучні пісалі стандартную праверачную працу, якую састаўлялі дваццаць закрытых і пяць адкрытых задач. Найлепшы вынік дасягнуў вучань, набіраючы 35 балаў (на 40 магчымых), самы нізкі паказчык — гэта 9 балаў. Сярэдні вынік у школе — 21,8 бала, у Гайнаўскім павеце — 21,6 бала, у Падляшскім ваяводстве — 22,4 бала, а ў маштабе краіны — 22,6 бала. Паводле дзевяцібальнай шкалы сярэдніх ацэнак Чаромхаўская ПШ апынулася ў пятым (сярэднім) інтэрвале гэтай шкалы. Гэта вышэйшая ацэнка ад мінулагодняй.

Апрача дасягненняў у навуцы і спорце вучні падставовай школы знаходзілі час і на культурна-турыстычныя мерапрыемствы. Арганізавалі экскурсію ў Вроцлаў на спектакль адукацыйнага тэатра „У крузе міфаў” і ў Ліў на археалагічны фэст. Арганізавалі веласіпедныя вандроўкі па наваколлі, бівак у Белавежы, паездкі ў Беласток на канцэрты ў філармоніі, на спектакль адукацыйнага тэатра „Кніга джунгляў” і „У пошуках загінуўшага скарбу”, паход у Судэты ды іншыя. Адзначалі Дзень дзіцяці, Дзень школьнага спорту, Свята Канстытуцыі 3 Мая, 20 гадавіну ўпадку камунізму ва Усходняй Еўропе, Дзень маці. Арганізавалі Вечар калядак, традыцыйныя Анджэйкі і Валянцінкі. Школа ўдзельнічала ў праграмах „Comenius”, „Экакалектывы” і „Шклянка малака”.

Дзіцячы садок

У мінулым навучальным годзе (2008/2009) садок наведвала 71 дзіця ва ўзросце 3-6 гадоў і двое дзетак ва ўзросце 7-8 гадоў (адтэрмінаваная навука ў першым класе). Навучанне праходзіла ў трох аддзелах — 2 у нулявым аддзеле і 1 для малодшых дзетак ва ўзросце 3-4 гады. У нулявым класе 13 дзетак (з агульнага ліку 33 дашкольнікаў) прадшколле наведала ўпершыню. На жаль, узровень іхніх ведаў быў намнога меншы, чым у тых, што раней хадзілі ў садок. У сувязі з гэтым спатрэбілася дадатковая кампенсацыйная праца. У чаромхаўскім прадшколлі 46 дзетак карыстаецца пяцігадзіннай пабыўкай, а 25 праводзіць у садку цэлы дзень. Малечы карыстаюцца трохразовым харчаваннем — сняданак, абед і падвячорак. Для 38 асоб Гміннны асяродак сацыяльнай дапамогі кампенсуе харчаванне — 29 атрымлівае сняданак і абед, 9 — трохразовае харчаванне. Навучаннем дзетак займаецца чатырох настаўнікаў (разам з дырэктарам) і двух катэхетаў, якія з'яўляюцца штатнымі работнікамі падставовай школы. У садку ладзіцца шмат цікавых мерапрыемстваў, напрыклад, Навагодняя ёлка, Мікалайкі, Дзень маці, Дзень дзядулі і бабулі, Вечар калядак і іншыя. Праводзіліся сустрэчы з паліцэйскімі (на тэму: „Не іду з незнаёмым”, „Паліцэйскі твой сябра”). Прадшколле ўдзельнічала ў праграме, арганізаванай санэпідэмстанцыяй, „Чыстае паветра вакол нас”, у рамках якой праводзіліся сустрэчы з акушэркай, са старшынёй Рады гміны. Дашкаляты ўдзельнічалі ў акцыі „Прыбіранне свету”, а ў мастацкім конкурсе на гэтую тэму малечы з Чаромхі заваявалі першае месца і атрымалі чатыры ўзнагароды. Садок наведваў аб'язны лялечны тэатр са спектаклямі „У пошуках загінуўшага скарбу”, „Ясь і Малгося” і „Залатая рыбка”. Чаромхаўскае прадшколле змяшчаецца ў старым драўляным будынку, але неўзабаве пачнецца будова новага, мураванага.

Уладзімір СІДАРУК

Вечар для душы

Сярод мільгаючай чарады працоўных дзён, вечар 7 лістапада 2009 года стаў сапраўдным „вечарам для душы” членам Камянецкага раённага грамадскага культурна-адукацыйнага аб'яднання „Спадчына” і іх сябрам з Рэспублікі Польшча, працаўнікам асродка культуры „Гладышка” ў Кляшчэлях.

Вялікае дзякуй за такі цудоўны вечар Святлане Каржук — дырэктару Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра, Ларысе Быцко — загадчыцы аддзялення традыцыйнай культуры гэтага цэнтра і Дарафею Фіёніку са Студзіводаў (Рэспубліка Польшча) — этнографу, гісторыку і сапраўднаму беларусу.

З Дарафеем Фіёнікам і калектывам „Жэмэрва” мы пазнаёміліся ў ліпені гэтага года, пабываўшы на фэсце аўтэнтычнага фальклору „Олень по бору ходіт”.

7 лістапада ў 18 гадзін у зале Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра пачалося „Палеска-Падляшскае вяселле”. Як было не парадавацца за „маладога” з Падляшша, і „маладую” з Палесся. Песні, танцы, скокі, гульні, жарты, родная мова агортвалі, песцілі кожнага прысутнага на вяселлі. Давялося нават паспрабаваць пышнага каравая. „Хорошы, наш коровай, хорошы, бо хорошы коровайныці робылы”.

А скончылася вяселле сумеснымі танцамі і артыстаў, і гледачоў. Ох і тупнулі мы там...

Высокаўскім аматарам фальклору было цікава параўнаць мясцовы вясельны абрад з „Палеска-Падляшскім вяселлем”.

Душу саграе тое, што не забывае моладзь пра векавыя абрады. А кожны абрад мае моц абярэга, які абараняе наша жыццё і робіць яго шчаслівым, поўным, доўгім пад мірным небам.

Старшыня КРГКАА „Спадчына”
Людміла ДУДАР

Адгаданка

1. збянтэжанасць, ганьба, 2. нізкая гліняная пасудзіна з выпуклымі бакамі і вузкім горлам, 3. літаратурнае прозвішча Зміцера Жылуновіча, 4. вакантная пасада, 5. кінематаграфія, 6. самец курыцы, 7. артыст хору, 8. прыгонны наглядчык у памешчыка, 9. цераз сілу не пацягне.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нідэрландская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 42 нумара

Ацёк, боль, Гусеў, сноб, суша, чад, чума, Чылі, Юта.

Рашэнне: **У час уцёкаў гіне больш салдат, чым у час бою.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Міхалу Байко** з Беластока.

1			2				
3					4		
		5				6	
		7			8		
						9	

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: http://niva.iig.pl/
E-mail: redakcja@niva.iig.pl
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Мірослава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 220 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (1)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Панарама на Дняпро з могілак у Гарошкаве

У Жыровічах, у момант развітання са святым месцам, да нас прыляцела раззяханая аўчарка. За сабакам валокся пяціметровы ланцуг, такі самы, на якім прышпільваюць у нас кароў на лузе. Мы яшчэ не ведалі, што нашым следам цягнецца не менш бразгучая легенда. Што ў сталічным Менску заслужаныя пісьменнікі і мастакі публікуюць сенсацыйныя ньюсы, між іншым, што з Мірай Лукшай і Ганнай Кандрацюк падарожнічае дух Анатоля Сыса. Наша тройца, дзе б не з'явілася, пакідае пасля сябе прыемны зёлкавы пах і ззянне святла...

У мяне не менш містычнае назіранне ад апошняга падарожжа ў Гарошкаў. Усюды, дзе б мы не з'явіліся, ці то на Гомельшчыне, ці то на Меншчыне, ці то на Гродзеншчыне, — за намі ганяліся ўсе сабакі Беларусі: аўчаркі, дварнякі, доберманы, таксы... Як верыць беларускі народ, у тым ліку я і Міра Лукша, дух памерлых прыходзіць менавіта на Дзяды і менавіта ў вобліку сабакі.

* * *

З Беластока ў Гарошкаў, калі ехаць праз Гродна — прыблізна семсот кіламетраў. У Амерыцы такая адлегласць — як у жменю плюнуць. Сеў сабе ў машыну і дуеш куды трэба. Праз пяць-сем гадзін ты на месцы, нават не ўпацееш. Інакш у нашым чароўным Падляшшы. З Беласточчыны на Гомельшчыну мы дабіраліся даўжэй, чым у Амерыку, разам 27 гадзін. Пасля, у роднай вёсцы паэта, мы адчувалі сябе так,

У акне хаткі, дзе абгарэла маці паэта, паказалася каза

быццам і не з'язджалі са сваёй падляшскай вёскі. Усё тут выглядала як у нас: пачуццё гумару, сабакі, стаўленне да жывых і памерлых...

Самы незразумелы адрэзак чакаў нас паміж Беластокам і Гроднам. Каб паспець на цягнік Гродна-Гомель, які адпраўляецца ў 18 гадзін 58 хвілін вечара, мы былі вымушаны перціся ў 5 гадзін раніцы. Іншай магчымасці, як паінфармавалі нас чыгуначныя службы, няма. У Саколцы, пакуль перасесціся ў цягнік на Кузніцу, трэба чакаць больш за гадзіну ў халодных і аблезлых мурах вакзальнага будынка.

— Давай лепш сходзім на цуд, — прапанавала я Міры, — хоць пагрэемся ў цяпле...

Яшчэ ў Беластоку я зірнула на ранішнюю прэсу. На першай старонцы самай папулярнай у Польшчы бульварнай штодзённі (тыраж: 2 мільёны) грымеў загаловак: *Цуд у Саколцы? Ашуканства!* У маёй недаспанай галоўцы бліснулі іскры. Гэта быў першы знак. Знак, які прамовіў словамі: дзяўчаткі, калі едзеце ў Беларусь, лепш не сумнявайцеся ў цудзе!

Беларускі дзядоўскі пачастунак

* * *

Бо так, як у Беларусі, нідзе на свеце не вераць у цуд. Пра паранармальныя з'явы тут апавядаюць больш рэальна як пра факты. У цудоўныя здарэнні вераць шырокія масы і вузкія эліты, у тым ліку калгаснікі, міліцыянты, празаікі, шафёры, журналісты...

Наша Саколка не горшая за Беларусь. Тут, у палове студзеня, меў здарыцца гучны цуд, якім амаль год кармілася ўся бульварная прэса Польшчы. Карацей, у час святога прычасця з рук святара ўпала аплатка. Згодна з абрадам, яе падняслі з падлогі і паклалі ў келіх са звычайнай вадой, каб там сабе расплылася. І здарыўся цуд... Навуковыя сілы горада Беластока адразу замест аплаткі пабачылі фрагмент чалавечага сэрца, пяць хвілін да смерці. Замест вады — кроў. Доследы ДНК рабіць пабаяліся.

У дарозе „на цуд" нас павітаў гімн „Kiedy ranne wstają zorze". Здавалася, што вакол храма будуць выстойваць абаронцы цуду. Ад сённяшняй прэсы, па-мойму, яны павінны стаць муром ля касцёла і паліць скандальныя газеты. (Kto daje i zabiera — ten się w piekle poniewiera!). Грэх сумнявацца ў цуд.

Нас за тое, што крыху пажартавалі з таго цуду, адразу сустрэла заслужаная кара. Цягнік у Кузніцу ад'ехаў перад назначаным часам. Але мы не здаліся, наадварот, як паніскі селі сабе ў таксі і паперлі ў Кузніцу, здаецца, нават абагналі ўцякаючы цягнік.

— Учора я таксама падвозіў такіх двух, — не хаваў задаволенасці ад нашага няшчасця таксіст, мясцовы татарын. — Яны таксама хадзілі на цуд...

Дзядзька абдзёр нас як ліпку, значыць, узяў у тры разы больш грошай, чым за ўсю дарогу з Беластока ў Гродна.

— Я люблю беларускіх дзяўчат, — загаворваў нам зубы таксіст-хітрэц, — бо ўчора, падвозіўшы студэнта і манашку, я ўзяў з іх намнога больш чым з вас, мае мілыя...

З печкі ў сваякоў Бельскіх любіў частавацца Анатоль

(Працяг будзе)

21.11 — 27.11

(22.03. — 20.04.) Знакаміта і свабодна пакажаш свае таленты і ўмеласці ды не аднаго задзівіш! Асобы, шукаючыя духовай сцежкі, знойдуць разумнага настаўніка. Справішся з фінансавымі турботамі і выйдзеш на простую дарогу.

(21.04. — 21.05.) 24-28.11. — час ашаламляльнай папулярнасці, асабліва ў іншага полу! З 25.11. (да 29.11.) лёгка можна цябе падвесці; трымай у гэты час вужа ў кішэні! Можаш шмат зарабіць у апошні тыдзень лістапада!

(22.05. — 22.06.) Твае дзеянні будуць вельмі паспяховымі ад 24.11. (да 28.11.) Будзеш праніклівы, дасціпны, рашучы. У апошнія дні тыдня будзеш нервовы (што можа перайсці і на партнёра!), цяжка будзеш пераносіць некаторых людзей. Не нервуйся паводзінамі суседзяў.

(23.06. — 23.07.) 20-24.11. не распавядай усюды, што шэф цябе не цэніць; твае заўвагі на яго тэму могуць абярнуцца супраць цябе! Новае цікавае знаёмства прыхарошыць тваё жыццё. Іграй у латарэю, можаш шмат выйграць!

(24.07. — 23.08.) 22-26.11. знакаміта выкарыстаеш свае козыры, умела схаваеш недасканаласці. Зробіш вялікае ўражанне і выклічаш павагу да сваёй асобы. Можаш паспяхова прымяніць нейкія натуральныя сродкі для свайго амалоджання.

(24.08. — 23.09.) Дасканалы момант на ўвядзенне трывалых змен у жыцці, але лепш не бярыся за важныя рашэнні. Можаш купіць штосьці даражэйшае. З канца тыдня будзеш вельмі здольны ў навуцы і ў здабыванні новых умеласцей; усё выкарыстаеш у штодзённым жыцці.

(24.09. — 23.10.) Будзеш творчы, кемлівы і паспяховы. 23-27.11. возьмешся за новыя дзеянні, але будзеш схільны перакрочваць правілы. Можаш падпасці шэфу!

(24.10. — 22.11.) Будзеш вельмі праніклівы; ніхто не зможа цябе падмануць. Знакамітая фізічная форма. Але твая жарснасць і схільнасць да моцных напояў могуць падвяргнуць цябе бядзе; 21-25.11. будзь памяркоўным! Хутка можаш зарабіць, ды зважай на асобы непрыхільныя табе.

(23.11. — 22.12.) Жыццерадаснасць, баявітасць, упэўненасць у сваёй рацыі. Моцна паправіцца твой настрой. Ды 21-25.11. прадбачваецца шэраг непрыемных сітуацый у пачуццёвым плане.

(23.12. — 20.01.) Агромная энергія ад Сонца. Хутка рэгенеруеш сілы, заробіш шмат грошай. Дзякуючы адвазе пакажаш свае магчымасці. З 26.11. (да 30.11.) пагражаюць табе клопаты ў падарожжы, са здароўем, празмерная колькасць работы.

(21.01. — 19.02.) Да 23.11. шмат нерваў і непраспаных начэй (сакрэты, плёткі). З 26.11. (да 30.11.) горыч; неспрыяльныя акалічнасці папсуюць табе планы, цяжка ва ўстановах. Хоць варта выбрацца на рамантычнае рандэву! Непаразуменні з партнёрам мінуць як рукой адняць, але прымі да сэрца парады сяброў. Можаш таксама наладзіць пару шматабяцаючых кантактаў.

(20.02. — 21.03.) 24-27.11. — будзеш мець падтрымку пры цяжкім выбары. Будзеш больш адкрыты і непасрэдны. Без праблем задбаеш пра сваё. Блізкая табе асоба здабудзе шмат у галіне, якой займаешся (ды ты і так лепшы!). Не ўсё ўдасца аформіць, але, слухаючы парад, абмінеш найгоршае.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960